№ 27 (337) 25 ліпеня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Вялікім грошам – вялікія кішэні

**Аляксандар Лукашэнка ініцыяваў вялікі перападзел нафтавага рынку. Неўзабаве зарабляць на нафтавым імпарце зможа толькі дзяржава. У тым ліку Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта.**

Ужо цяпер дзяржструктуры (Наваполацкі НПЗ, «Беларуснафта», канцэрн «Белнафтахім» і прадпрыемства Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта «Белая Русь») пастаўляюць у краіну 2/3 усёй нафты. Рэшту падзялілі «Слаўнафта-МНПЗ», «Слаўнафта-Старт», «Лукойл-Інтэрнэшнл», «Літаска», «Трайпл» ды «Бурбуд». Дзяржаўныя нафтатрэйдэры выбіліся наперад сёлета, калі большасьць камэрцыйных пастаўшчыкоў не змаглі ці не пажадалі пайсьці на ўмовы «Белнафтахіму»: перапрацоўка 3 тыс. тонаў нафты — у абмен на 1 млн інвэстыцыяў у нафтахімію. Дзяржава можа падмяць пад сябе і рэшту «незалежных» нафтатрэйдэраў.

«Ніякіх пасярэднікаў!» — скамандаваў кіраўнік дзяржавы. Ад 1 студзеня бартэрныя пастаўкі нафты ў Беларусі апынуцца па-за законам. Гэтая дата можа стаць канцом вялікага перападзелу на нафтавым рынку. Такія перападзелы ў суседніх краінах ніколі не абыходзіліся без эксцэсаў. Бывала, што і кроў лілася.

**Мікола Бугай**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# ФАРМАТ 27 ЛІПЕНЯ

**Дзень Незалежнасьці 27 Ліпеня да 1996 году быў дзяржаўным сьвятам. Пасьля яго абхаялі ўлады, узурпавала апазыцыя. Былі дэманстрацыі, для пары дзясяткаў чалавек гэты дзень запомніўся адседкамі на Акрэсьціна. Але нешта не прыпомніцца, каб цэрбэры рэжыму надта лютавалі ў гэты дзень. Ну, сьвята ж новае, ад сьпякоты трохі млявае. Не Вялікдзень і ня Дзень Волі, адным словам. Але цікавае каляндарнай блізкасьцю з галоўнымі нацыянальнымі сьвятамі шэрагу буйных нацый. У ЗША 4 ліпеня, у Францыі 14 ліпеня, ва Ўкраіне 24 жніўня.**

**У любым разе гэты дзень у нацыянальнай гісторыі застанецца, хоць яго ніколі не сьвяткавалі як сьлед. Як-ніяк, а Рэспубліка Беларусь заявіла пра незалежнасьць. Гэта не Каляды, але ж і які-небудзь Макавей мае свой «фармат» сьвяткаваньня. А які фармат магло б мець сьвята 27 Ліпеня? Як яго адзначаюць у беларускіх асяродках?**

**А таксама: пра што думаў Станіслаў Шушкевіч, калі праводзіў Дэкларацыю аб сувэрэнітэце праз калгасна-вэтэранскі Вярхоўны Савет? — гутарка зь першым кіраўніком незалежнае Беларусі. Ад каго і чаго цяпер незалежная Беларусь? — артыкулы Віталя Сіліцкага й Паўла Севярынца. Маленькае апавяданьне Евы Вежнавец з нагоды невялікага сьвята ды верш Андрэя Хадановіча з тае самае нагоды. Тэма нумару — старонкі 11—15.**

## Пятнаццаць сутак за ўлёткі

**А 3-й гадзіне ночы 23 ліпеня ў Менску былі затрыманыя маладафронтаўцы Зьміцер Дашкевіч, Артур Фінкевіч і непаўналетні Алег Гнечык, якія расклейвалі ўлёткі.** Затрыманьне праводзілі супрацоўнікі вядомага Савецкага райупраўленьня (менавіта ягоныя супрацоўнікі зламалі 4 месяцы таму руку Антону Кішкурну, а месяц таму брутальна разагналі акцыю ў абарону ліцэю). У пратаколах міліцыянты напісалі, што хлопцы чапляліся да мінакоў, нецэнзурна лаяліся і супраціўляліся падчас затрыманьня. Паводле словаў маладафронтаўцаў, ахоўнікі парадку паставіліся да іх жорстка. Найбольш дасталося ад міліцыянтаў А.Гнечыку.

Усю ноч правялі ў пастарунку З.Дашкевіч і А.Фінкевіч (А.Гнечыка выпусьцілі раней). Ураньні хлопцаў адвезьлі ў суд, але судзьдзя Руслан Казадаеў перанёс паседжаньне на 29 ліпеня: не зьявіліся сьведкі-міліцыянты. Абодва маладафронтаўцы пакуль што вызваленыя з-пад варты, але ім пагражае 15 сутак зьняволеньня.

**Аркадзь Шанскі**

## Маральнае старэньне і пяціпартыйны навічок

У пераліку на прэзыдэнцкі цыкл 2003 год адпавядае 1998-му. Самы змрочны час на лукашэнкаўскім календары прыпадаў на 1999 г. Але і за год да кульмінацыі хапала брыды: і «Свабоду» зачынялі, і Ліцэй душылі, і з Быкавым змагаліся. Усё як сёлета.

Але сёлета змрочныя справы адбываюцца на зусім іншым фоне. За пяць гадоў адбыўся пералом у мысьленьні людзей. Яны перастаюць спадзявацца на дзяржаву. Забываецца шок інфляцыі пачатку 90-х. Усё больш выбарцаў, ня толькі маладых, але і старэйшых, перасталі «намарна на лёс свой наракаць», а паглядаюць у будучыню з аптымізмам. Дзіва што 65% апытаных выбарцаў ідэя «трэцяга тэрміну» недаспадобы. Ну што такога можна зрабіць за пяць гадоў, чаго не патрапіў за дванаццаць?

Можна паўтарыць Лёзна, можна даць пытлю дзесяці міністрам і раскрыць змову вашывых блохаў з тлустымі катамі. Можна не дапусьціць да выбараў нікога, акрамя Статкевіча з Гайдукевічам. Можна перайначыць Канстытуцыю, урэшце. Але ўсё гэта ўжо было, было.

Таму такім вычарпаным выглядаў кіраўнік дзяржавы перад камэраю НТВ. Ягоныя падыходы да кіраваньня краінай перасталі прыносіць краіне карысьць. Ён сам адчувае, як маральна старэе. Ягоны правераны кадравы рэзэрв, колькі ні мяняй жучку на Ўнучку, выпрацаваны.

Стаўка на сілу, «навядзеньне парадку» была правільнаю, калі на краіну ў сярэдзіне 90-х напаўзала з усходу хваля анархіі і бясправўя. Але цяпер больш не спрацоўвае. А парадак, які сілавыя структуры «наводзяць» у бізнэсе, хутка зусім паралізуе там жыватворную канкурэнцыю.

Лукашэнкаўцы зубамі трымаюцца за статус-кво — найперш у адносінах з Расеяй, а як вынік, і ва ўнутранай палітыцы. Ці магло б адбыцца амаладжэньне і пераражэньне рэжыму? На гэта спадзяваліся некаторыя аналітыкі. Дарэмна.

Працэс маральнага старэньня незаўважны, пакуль няма з чым параўноўваць ягонага суб’екта. «Альтэрнацівы нет!» — настойваюць прапагандысты. «А што нам эці парціі даюць?» — паўтараюць з экрану БТ. Прапаганда дае эфэкт, пакуль партыяў дзесяць, а лідэраў сто. Але варта насустрач шуляку вылецець другому шуляку, а ня статачку вераб’ёў, як стане відавочным тое, што ўжо сталася рэальным.

Супрацоўніцтва пяці партый — АГП, БНФ, БСДГ, працавікоў і камуністаў, скіраванае супраць «трэцяга тэрміну», шмат абяцае ў доўгатэрміновай пэрспэктыве. Дэмакратыя, незалежнасьць, адмова ад палітычнае актыўнасьці на расейскім полі, эўраінтэграцыя, абарона бясьпекі чалавека і непарушнасьць грамадзянскіх свабодаў — гэтыя прынцыпы адстойваюць усе партыі. Узьнікненьне такога саюзу — вынік росту грамадзянскай сьвядомасьці сяброў гэтых розных, і правых і левых, партый. Былыя, яшчэ савецкія падзелы або розная ацэнка савецкае спадчыны маюць цяпер роўна столькі ж значэньня, колькі хто кім працаваў у 1913 ці 2001 г. Палітыкі пакідаюць гісторыкаў займацца гісторыяй. Вось што значыць новы пяціпартыйны саюз.

Спробы штучна зьяднаць жукоў з трянскімі жабамі, што пачаліся якраз пяць гадоў таму, на папярэднім вітку прэзыдэнцкага цыклу, адбілі ў многіх выбарцаў цікавасьць да палітычнае матэматыкі. Але гэта не адмаўляе яе закону: складаньне патэнцыялаў вядзе да памнажэньня вынiку. «Безальтэрнаціўнасьць» жа абяртаецца адзінотай і адсутнасьцю пераемнікаў.

**Барыс Тумар**

# Сюрпрызы й сьмерць на 14-м «Басовішчы»



ГАННА КАНДРАЦЮК, «НІВА»

**«Басовішча» пачыналася праблемна: адзін з аўтобусаў, які вёз рок-фанаў у Гарадок, недалёка ад’ехаў ад Менску. На зьмену зламанаму сьпешна быў знойдзены іншы, але й той не пераехаў польскае мяжы. Частка пасажыраў вярнулася дахаты, але хто-ніхто да «Басовішча» дабраўся. Старонка 6.**

# Беларусы працуюць над сабой

**Беларусь — адзіная з краінаў СНД, што ўваходзіць у групу высокаразьвітых. Але гады кіраваньня Лукашэнкі паглыбілі наша адставаньне ад Польшчы й Літвы. Гэта вынікае з «Дакладу аб разьвіцьці чалавека», падрыхтаванага ААН.**

Гэты даклад штогод рыхтуецца незалежнымі экспэртамі на замову Праграмы ААН па разьвіцьці. Дзеля маруднасьці апрацоўкі зьвестак, сёлетні грунтуецца на статыстыцы за 2000—2001 г. Індэкс разьвіцьця чалавечага патэнцыялу — гэта сярэдні паказчык, які адлюстроўвае даўжыню жыцьця і здароўе, ступень распаўсюджанасьці ведаў і пісьменнасьці, узровень жыцьця людзей.

Першае месца ў рэйтынгу займае Нарвэгія, апошняе — Сьера-Леонэ. Беларусь узьнялася, проці мінулага году, з 56-й на 53-ю пазыцыю. ЗША займаюць сёмы радок, Польшча — 35-ы, Літва — 45-ы, Латвія — 50-ы, Расея — 63-і, Украіна — 75-ы.

Першыя 55 краінаў сьпісу, з індэксам, вышэйшым за 0,800 (на шкале ад 0 да 1), аднесеныя да шэрагу высокаразьвітых. Цікава, што ў гэтую групу ня трапілі такія кандыдаты на ўступленьне ў Эўразьвяз, як Румынія й Баўгарыя.

## Расея адстае

У параўнаньні з папярэднім дакладам, павялічыўся разрыў у якасьці жыцьця між Расеяй і Беларусяй.

У Расеі нарастае галеча найбяднейшых слаёў насельніцтва і няроўнасьць паміж рэгіёнамі. Калі індэкс чалавечага разьвіцьця Масквы, Татарстану, Цюменскай вобласьці роўны чэскаму ці вугорскаму, дык у Чыцінскай вобласьці й Туве ён на ўзроўні Габону. У суседніх зь Беларусяй абласьцях Расеі рэйтынг вагаецца паміж кітайскім і туркмэнскім узроўнямі (0,720—0,750). Для параўнаньня: у Беларусі — 0,804; у Чэхіі — 0,861; у Нарвэгіі, якая ўзначальвае сьпіс, — 0,944. Акрамя таго, доля бедных у вясковых раёнах Расеі перавышае 50%, а ў гарадах — 40%. Асабліва нэгатыўны ў нашых суседзяў «дыяпазон няроўнасьці». Сярэдні даход 10% найбагацейшых жыхароў большы за даход 10% найбяднейшых у 20,3 разу. Для параўнаньня: у Нарвэгіі — 5,3; у Польшчы — 7,8; у Беларусі — 6,9; ва Ўкраіне — 6,4. Суадносіны аплаты працы мужчынаў і жанчынаў у Расеі таксама працягвалі пагаршацца. Калі на пачатку 1999 г. сярэдняя жанчына ў Расеі зарабляла 56% ад заробку сярэдняга мужчыны, дык у 2000 г. гэтая лічба ўпала ніжэй за 50%. Да таго ж, доля насельніцтва ў рэпрадуктыўным веку, заражанага ВІЧ-інфэкцыяй, дасягнула 0,9% (Беларусь — 0,27). Ступень пранікненьня высокіх тэхналёгій у Беларусі, паводле ацэнак ААН, таксама вышэйшая, чым у Расеі. Так, у 2001 г. Інтэрнэтам у Беларусі карысталіся 4,2% насельніцтва проці 2,9% у «саюзьнікаў». Дый у пераразьліку на пакупніцкую здольнасьць памер ВУП на душу насельніцтва ў Беларусі большы: 7620 даляраў проці 7100 у Расеі.

## Польшча й Літва абганяюць

Затое адставаньне Беларусі ад сваіх заходніх суседак за 1995—2001 г. паглыбілася. Прычым гэта адбылося як па эканамічных парамэтрах (пераразьлічаны ВУП на душу насельніцтва дасягнуў у Польшчы 9450 даляраў, у Літве — 8470 даляраў), так і па доступе да тэхналёгій: на 1000 чалавек у Беларусі прыпадала 302 тэлефоны, тады як у Літве — 590, а ў Польшчы — 554. Калі ў 1995 г. па гэтым паказчыку Беларусь стаяла на параўнальных з суседкамі пазыцыях, дык яе пазьнейшая самаізаляцыя прывяла да запазьненьня з прыходам новых, мабільных тэхналёгій. Дзіцячая сьмяротнасьць у Беларусі ўдвая вышэйшая за паказчыкі ў заходніх суседзяў.

Трэба адзначыць, што розьніца між узроўнем ВУП па парытэтнай пакупніцкай здольнасьці і рэальным ВУП у Беларусі — адна з найбольшых у сьвеце. Таму па меры збліжэньня ўнутрыбеларускіх цэнаў зь сярэднесусьветнымі паказчык «узроўню жыцьця» будзе падаць, а зь ім — і месца Беларусі ў сусьветным рэйтынгу.

Больш падрабязна пра сьвет у люстэрку статыстыкі — у наступных нумарах «НН».

**Мікола Бугай**

---

ЛІЦЭЙ

# Бацькоў выклікаюць па адным




ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**Прэзыдыюм Рады БНР 22 ліпеня прыняў зварот да ўрадаў заходніх краінаў у зьвязку з закрыцьцём Беларускага ліцэю. Наваствораны Менскі дзяржаўны гуманітарны ліцэй застаецца на паперы. Гарадзкія ўлады зьбіраюцца рамантаваць будынак на Кірава, 21 аж два гады.**

Насуперак абяцаньням кіраўніцтва Мінадукацыі (намесьнік міністра Казімер Фарына на сустрэчы з бацькамі 27 чэрвеня дэклараваў, што рамонт будынку скончыцца да 15 жніўня), увосень навучэнцы ня змогуць вярнуцца ў свой будынак. Нявырашаным застаецца і пытаньне з выкладчыкамі. Браць ці ня браць старыя ліцэйскія кадры — будзе вырашаць пакуль яшчэ не прызначаны дырэктар.

Раскіданьне ліцэйскіх клясаў па ўсім горадзе — гэта «часовая мера», на год, пакуль будзе ісьці капітальны рамонт будынку, кажа начальнік упраўленьня адукацыі гарадзкога камітэту адукацыі Аляксей Воранаў. І дадае: «Калі ж бацькі не пагодзяцца на прапанаваныя намі ўмовы, дык мы разьмесьцім іх дзяцей у любой іншай навучальнай установе — школе, гімназіі ці ліцэі». Чыноўнікі пачалі з гэтага тыдня выклікаць бацькоў ліцэістаў, каб «паведаміць аб пераводзе навучэнцаў у іншыя навучальныя ўстановы», фактычна — схіліць іх да згоды на гэткі перавод. Бацькі адмаўляюцца хадзіць у аддзел адукацыі па аднаму і патрабуюць, каб чыноўнікі наведалі агульны бацькоўскі сход і распавялі пра сваё рашэньне ўсім. Дзеля супрацьдзеяньня ўціску на агульным сходзе 21 ліпеня было вырашана стварыць Камітэт абароны ліцэю і прапанаваць усім беларускім партыям, грамадзкім рухам, арганізацыям і асобным грамадзянам да яго далучыцца.

Таксама абмяркоўвалася пытаньне пра недзяржаўны статус ліцэю і, магчыма, пераход установы ў структуру Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту. Для вырашэньня гэтага пытаньня У.Колас зьбіраецца стрэцца з Уралам Латыпавым. Актыў ліцэю разьлічвае, што будынак ліцэю застанецца за ўстановай на ўмовах бясплатнае і бестэрміновае арэнды. У такім разе сам ліцэй узяў бы на сябе абавязак знайсьці сродкі на рамонт будынку і ўтрыманьне ўстановы.

**АШ**

---

## На правільнага ворага зь няправільнымі саюзьнікамі



IREX-PROMEDIA

Супрацоўнікі праваахоўных органаў ужо добра вывучылі каляндар нацыянальных сьвятаў і няблага ведаюць іх сутнасьць. 25 сакавіка, 8 верасьня, 2 лістапада падкрэсьленыя чырвоным у нататніках спэцслужбаў. Бо на гэтыя дні лепш не плянаваць нейкіх «адгулаў за прагулы» — прыйдзецца сачыць, затрымліваць ды выконваць іншыя малапрыемныя працэдуры. Адмоўнасьць канатацыі мае не такое вялікае значэньне. Галоўнае — даты адкладаюцца ў людзкіх галовах.

І сьпіс сьвятаў пашыраецца. Дазнаўшыся пра белчырвона-белы сьцяг, вывешаны 15 ліпеня на суседнім з Камітэтам будынку, хто-ніхто з кадэбістаў пацікавіўся: а што ж гэта за дзень? Дзеля чаго рызыкавалі тыя зуброўцы, калі вешаліся па старых лесьвіцах?

Грунвальд для сёньняшняй афіцыйнай гістарыяграфіі — бітва з правільным ворагам у хаўрусе зь няправільнымі саюзьнікамі. Таму гэтак сарамліва — двума сказамі — ён згадваецца ў Трашчанковым падручніку. Абысьці яго, як бітвы на Сініх Водах ці ля возера Дурбэ, было немагчыма. Пра Грунвальд згадваў нават Пятрусь Броўка ў паэме, напісанай за Сталіным, у вайну.

Гарадзенцы сёлета наракалі, што афіцыйна адсьвяткаваць гадавіну Грунвальдзкай бітвы ім не дазволілі. А мо і лепей несанкцыянавана ўскласьці кветкі да помніка Вітаўту, чым слухаць гадзінныя даклады пра значэньне перамогі над крыжакамі.

Гэтак і з Днём Незалежнасьці — рэдкім для нас сьвятам, не расчыненым на крыві патрыётаў. Ёсьць выпадкі, калі лепш проста сьвяткаваць, чым дабівацца афіцыйнага сьвяткаваньня, і проста зьбірацца, а не дабівацца афіцыйнае рэгістрацыі. Для сябе ж жывём, а не для «гэнага дзядзькі».

**Сяргей Мікулевіч**

---

# Сто гадоў ад зруйнаваньня Бастыліі

Не чуваць з вулічных рэпрадуктараў бадзёрых мэлёдый, не рапартуюць працоўныя калектывы аб датэрміновым выкананьні плянаў юбілейнага году, не салютуе піянерыя, не дакладвае ленінскі камсамол, не плянуецца ўрачыстае паседжаньне з удзелам прадстаўнікоў прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і воінскіх падразьдзяленьняў — пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва, ня пішуць вялікага дакладу для першага сакратара ЦК, не рыхтуюцца спартоўцы да масавага шэсьця па Ленінскім праспэкце з вэтэранамі на чале, не прадугледжана вялікага ўскладаньня вянкоў і кветак да помніка на плошчы Леніна ад працоўных калектываў на чале з камунабізнэсоўцамі зь фірмы «Velcom», а часопіс «Полымя» не пачне публікацыі новага рамана Івана Ш. «Брусэль—Лёндан», у якім паказаныя сацыял-здрадніцкая сутнасьць Пляханава, апартунізм і хвасьцізм Мартава, палітычны авантурызм Троцкага і геніяльная прадбачлівасьць Леніна...

Што ж гэта робіцца, дарагія сябры? Толькі асобныя гісторыкі згадваюць, што сёлета ў пачатку жніўня спаўняецца сто гадоў розуму, гонару і сумленьню нашае эпохі, партыі новага тыпу — партыі бальшавікоў. Тае самае партыі, што абяцала пабудаваць камунізм і золатам аздобіць грамадзкія прыбіральні.

...Толькі людзі, якія вучылі К.Маркса паводле цытатнікаў ці дадатку да кароткага курсу гісторыі ЎсеКП(б), могуць сьцьвярджаць, што ленінізм ёсьць працягам марксізму, што Ленін быў ня толькі сацыял-, але й дэмакратам. Марксізм быў і застаецца адною зь вялікіх эўрапейскіх дактрынаў. Якімі ж ідэямі ўзбагаціў эўрапейскую культуру ленінізм? Гэта чыста палітычная ілюзорная канструкцыя, на аснове якой узьнік бальшавізм — экстрэмісцкая форма палітычнае дзейнасьці і ажыцьцяўленьня ўлады.

На палітычным рынку, як і на ўсякім іншым рынку, дзейнічае жалезны закон: попыт нараджае прапанаваньне. Дэмагогі — большыя і драбнейшыя — таму і прыходзяць, што на іх ёсьць попыт.

Бальшавіцкі пераварот ня быў выпадковасьцю. Прыніжаны й



IREX-PROMEDIA

абражаны, на тры чвэрці непісьменны расейскі люд, над якім стаялі дзяржыморды з паліцыі і казённае духавенства, хацеў валадарства Божага на зямлі. І Ленін паабяцаў яго: усе будуць роўныя, улада будзе належаць Саветам, зямля — сялянам, фабрыкі — рабочым.

Зрэшты, падманваліся і больш адукаваныя народы, народы з традыцыямі прыватнае ўласнасьці, Рэнэсансу і Рэфармацыі, камунальнага самакіраваньня. Але тут неабходна адзначыць тое, што і Мусаліні, і Гітлер усталяваньне сваіх рэжымаў называлі рэвалюцыямі.

Бальшавіцкая чума, як і фашыстоўская, мае ўласьцівасьць набываць розныя формы, прыстасоўвацца да абставінаў, мяняць лёзунгі, але сутнасьць яе застаецца адною і тою самаю — таталітарызм або аўтакратыя з імкненьнем да таталітарызму, варожасьць да культуры, прагрэсу.

Ніхто ня скажа, колькі спатрэбіцца часу, каб дарэшты зьнікла небясьпека гэтае чумы. Францускаму народу, каб канчаткова прыйсьці да дэмакратыі, спатрэбілася амаль сто гадоў пасьля зруйнаваньня Бастыліі.

**Анатоль Сідарэвіч**

# Мы перамаглі кітайцаў




**Абсалютным пераможцам 35-й Міжнароднай хімічнай алімпіяды сярод школьнікаў, што прайшла ў Афінах, стаў віцебскі дзесяціклясьнік Аляксей Путаў. Тры астатнія спаборнікі — Вячаслаў Бернат, Аляксей Лушчынскі і Аляксандар Жданко — узнагароджаныя срэбнымі мэдалямі.**

**У Алімпіядзе бралі ўдзел школьнікі з 59 краін. Аляксей Путаў здолеў заняць месца, якое ў апошнія гады традыцыйна належала кітайскім удзельнікам. Нашая сыстэма адукацыі, насуперак безграшоўю, дае добрыя веды (тым, хто хоча іх атрымаць). Дый шматузроўневая сыстэма школьных, раённых, абласных, рэспубліканскіх алімпіядаў дазваляе знайсьці гэтыя таленты ды падтрымаць іх маральна (каб яшчэ і матэрыяльна...)**

**Амаль дзесяць гадоў мэтадычным кіраўніком хімічных алімпіядаў абласнога і нацыянальнага ўзроўняў зьяўляецца дацэнт катэдры агульнай хіміі і мэтодыкі выкладаньня хіміі БДУ Віктар Хвалюк. Гэта ён распрацаваў праграму перадалімпіяднае падрыхтоўкі, якая прывяла нацыянальную каманду да перамогі. Нялішне дадаць, што ў Ліцэі БДУ В.Хвалюк — настаўнік усіх трох сёлетніх срэбных прызёраў.**

**АР**

На здымку: зьлева направа — Вячаслаў Бернат, Аляксей Путаў, Аляксандар Жданко, Аляксей Лушчынскі.

## • ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА •

### Бывайце, танныя іншамаркі

**У жніўні ўдвая павялічыцца збор за мытнае афармленьне транспартных сродкаў, увезеных з-за мяжы. Дагэтуль «растаможка» каштавала даляраў 500, а ў хуткім часе складзе 800—900.** Наймацней скокнуць цэны на старыя машыны (10—14 гадоў). Той, хто захоча ўвезьці ў Беларусь машыну 1990 г. з 2-літровым рухавіком, павінен будзе плаціць на мытні 4 тыс. эўра. Не абкладаюцца зборам толькі патрыманыя «Жыгулі», набытыя ў любой краіне сьвету.

### Беларуская кампанія — у першай сотні сусьветных

**Упершыню беларуская кампанія трапіла ў «першую сотню» карпарацый сусьветнага вайскова-прамысловага комплексу.** Згодна зь сьпісам амэрыканскага выданьня «Defense News», беларуска-расейская карпарацыя «Аэракасьмічнае абсталяваньне» — на 62 месцы ў рэйтынгу. Летась яе ў сотні не было.

### Тысяча мільянэраў у краіне

**Падатковыя службы, аналізуючы дэклярацыі аб даходах за 2002 г., прыйшлі да высновы, што прынамсі 200 грамадзянаў краіны зарабляюць звыш мільёна даляраў штогод.** Кіраўнік аналітычнага цэнтру «Стратэгія» Леанід Заіка мяркуе, аднак, што ў рэальнасьці «даляравых мільянэраў» у Беларусі разоў у пяць болей. «Варта браць пад увагу ня толькі прыбыткі, але і маёмасьць — рухомую і нерухомую. Да таго ж, калі ёсьць людзі, якія дэкляруюць мільённыя прыбыткі, дык ёсьць і тыя, хто ўтойвае нашмат большыя», — лічыць эксперт.

### Маштабнае будаўніцтва ў Менску

**У Менску пачынаецца новае маштабнае будаўніцтва.** У межах вуліцаў Ціміразева і Нарачанскай разьмесьціцца ўнівэрсытэцкая зона. 14 га зойме комплекс Міжнароднага гуманітарнага інстытуту БДУ з вучэбнымі карпусамі, інтэрнатамі, жылымі шматпавярхоўкамі. Праект фінансуе амэрыканска-ізраільскае прадпрыемства. Яшчэ 8 га аддадуць пад гарадок Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту. Будаўніцтва мяркуюць скончыць да 2005 г.

Апроч таго, паўстануць два новыя бізнэс-цэнтры. Адзін зь іх, між вул. Кастрычніцкай і Леніна, збудуе замежнае прадпрыемства «Алезіяс». Ён будзе 16-, а мо нават 24-павярховым (канчатковае рашэньне яшчэ не прынята). Другі гандлёва-адміністрацыйны комплекс мае быць збудаваны на пр.Машэрава (былая кавярня «Рэчанька»). Замоўца — замежнае прадпрыемства «РубіРозІнтэрнэйшнл». Першыя чатыры паверхі будынку зоймуць крамы, астатнія 12 — офісы.

### «Расбанк» прыходзіць у Беларусь

**«Расбанк», адзін з найбуйнейшых расейскіх банкаў, адчыняе ў Беларусі даччыны «Белрасбанк».** У новым банку таксама ўдзельнічае беларуска-расейскае прадпрыемства «Яравіт». Працаваць ён зьбіраецца з прадпрыемствамі энэргетычнага комплексу. Статутны фонд складзе 5 млн эўра. Адным з акцыянэраў «Расбанку» зьяўляецца «Сургутнафтагаз», што мае інтэрас на беларускім нафтаперапрацоўчым рынку. Гэта будзе 30-ы зарэгістраваны ў краіне банк. «Расбанк» пераважна абслугоўвае прадпрыемствы холдынгу «Інтэррос», якім кіруе Патанін.

### Скандал у Пухавічах

**Дзяржкантроль выявіў, што кіраўнікі Пухавіцкага лікёра-гарэлачнага заводу не даплацілі ў бюджэт 29,5 млн руб. падаткаў.** На думку ведамства Тозіка, даход ад продажу прадуктаў на 70 млн руб. Тураўскаму кансэрваваму камбінату быў прыхаваны наўмысна. На прадукцыю, якая захоўваецца ў Тураве, накладзены арышт.

### З краіны больш выяжджае, чым прыяжджае

**Летась Украіну наведалі 1870 тыс. беларусаў, Польшчу — 1570 тыс., Літву — 520 тыс.** У Беларусь найбольш замежнікаў прыяжджала зь Літвы (810 тыс.), Польшчы (700 тыс.), Латвіі (235 тыс.). Усяго з краіны летась выяжджалі 6 млн чалавек, а наведалі яе каля 2 млн замежнікаў. На жаль, зьвесткі пра перасячэньні расейскай мяжы ня ўлічваюцца.

### Ляйкра ад «8 сакавіка»

**Гомельскае ААТ «8 сакавіка» ўпершыню ў краіне пачне выпускаць палотны з выкарыстаньнем ляйкравай ніці, а таксама трыкатажныя вырабы зь іх.** Кабетам дужа падабаюцца калготкі ды панчохі зь ляйкрай, бо яны элястычныя ды бліскучыя. Выраблядь ляйкру будуць на абсталяваньні, якое набылі ў Нямеччыне. Штогод «8 сакавіка» выпускае каля 7 млн параў панчохаў ды шкарпэтак.

### Саламяны кароўнік

**Фэрму з прасаваных цюкоў саломы збудавалі ў калгасе імя Суворава (Пастаўшчына) паводле праекту няўрымсьлівага старшыні Алега Валадзька.** Гэткая тэхналёгія эканамічная: зімою саламяныя сьцены добра трымаюць цяпло, а ўлетку — прахалоду. Дый будматэрыял бясплатны.

### Нямеччына шукае праграмістаў

**Да 31 сьнежня 2004 г. працягнутая праграма фэдэральнага ўраду Нямеччыны «Грын-кард» для прыцягненьня высокакваліфікаваных праграмістаў з-за мяжы.** Тэрмін быў працягнуты, бо да 21 ліпеня 2003 г. патрэбныя 20 тыс. спэцыялістаў не знайшліся. Было выдадзена толькі 14,5 тыс. «зялёных картак». Найбольш сярод праграмістаў-імігрантаў індыйцаў (22%), 14% прыехалі з СНД і Балтыі, 8% — з Румыніі.

### «Кодак» возьмецца за рэнтгены

**Амэрыканскі фотаканцэрн «Eastman Kodak» купіць за 500 млн даляраў фірму «PracticeWorks» — вытворцу праграмнага забесьпячэньня для рэнтгенаўскіх апаратаў.** «PracticeWorks» — адзін зь лідэраў у галіне лічбавай стаматалягічнай радыяграфіі. Гэта ня першая інвэстыцыя «Кодаку» ў мэдыцыну. Здаўна канцэрн зьяўляецца буйным вытворцам рэнтгенаўскіх фотапласьцінак. Традыцыйныя фотатэхналёгіі трацяць папулярнасьць, прыбыткі ад продажу фотаматэрыялаў падаюць, і «Кодак» думае, як утрымаццца на рынку ў новым лічбавым сьвеце.

### 68% гандлю — у прыватнікаў

**Паводле дзяржаўнай статыстыкі Віцебшчыны, за першае паўгодзьдзе сёлета на долю рынкаў прыпадае 36% тавараздвароту, крамаў — 64%.** Доля прыватных гандлёвых прадпрыемстваў узрасла да 68% ад тавараздвароту.

**АК, БелаПАН, АФН, Reuters**

## АСОБЫ ТЫДНЯ

**Кіраўнік ТБМ Алег Трусаў** зьвярнуўся да Старшыні Канстытуцыйнага суду **Рыгора Васілевіча** з запытам наконт законнасьці таго, што інфармацыя на таварах афармляецца толькі па-расейску. Ведамства Васілевіча пастанавіла: гэта незаконна. І вось новыя стандарты адносна нехарчовых тавараў ужо замацавалі абавязковую наяўнасьць беларускамоўнага цэтліка. Цяпер тэбээмаўцы рыхтуюць адпаведныя пераклады для стандартаў харчовых тавараў. Вось дык Трусаў! А яшчэ з пасады сыходзіць хацеў.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Архітэктар Уладзімер Даніленка** зьбіраецца ўсталяваць на Нямізе дзевяцімэтровую капліцу Збаўцы на Крыві. Збудаваць капліцу прасілі бацькі тых, хто загінуў на Нямізе ў 1999-м. Гэта больш па-людзку за чыгунныя кветкі. Галоўнае, каб зь Верхнім горадам каплічка лепей гарманавала, чым «Востраў сьлёз» з Траецкім.

**Актывісты КХП-БНФ** сабралі каля 1500 подпісаў пад заявай у Вярхоўны суд з просьбай прызнаць саюзную дамову неадпаведнай Канстытуцыі. Але суд адмовіўся ўзбуджаць справу. Ініцыятары зьбіраюцца зьвярнуцца ў Камісію па правах чалавека ААН. Толькі тамтэйшая бюракратыя па 10 гадоў, бывае, марудзіць з разглядам.

**Рычард Пэрл**, галоўны дарадца міністра абароны ЗША, не выключае, што Хусэйн можа паспрабаваць схавацца ў Беларусі. Ніякімі доказамі ён сваю вэрсію не падмацаваў. Ня верыцца нешта. Лукашэнка пакуль ня маркесаўскі Патрыярх, каб ствараць пансіянат для зрынутых дыктатараў.

**Удэй і Кусэй** нежывыя. А разам зь імі загінуў і 14-гадовы ўнук Хусэйна. Заплаціў за дзедавы злачынствы.

**Мянчук Вольф Рубінчык** выдаў першы нумар часопісу «Шахматы». У ім — ня толькі шахматныя задачы. Багата гісторыі, успамінаў, ёсьць нават паэзія. Выдаецца новы часопіс на беларускай і расейскай мовах. Адчуваецца, што справа рэдактару да душы.

Новую газэту выдаў і **Зьміцер Бародка,** лідэр барысаўскіх зуброў. На-



зываецца «BY-ZONE», выходзіць на 4-х старонках, раздаецца з рук. З часам зуброўцы спадзяюцца выйсьці з «андэграўнду» і ператварыць «BY-ZONE» у паўнавартасную газэту для ўсёй краіны. А **зуброўцы** Гарадзеншчыны вывесілі бел-чырвона-белыя сьцягі пры ўезьдзе ў Ваўкавыск з боку польскае мяжы, а таксама на высакавольтных лініях і воданапорных вежах уздоўж шашы Горадня—Ліда—Менск. Словам, пасьлявыбарную дэпрэсію рух пераадолеў.

**Анатоль Вайцяхоўскі** з Баранавіч цяпер ня зможа друкаваць сваю «Местную газету «Шаг» у слонімскай друкарні. Адмову ад далейшага супрацоўніцтва ён атрымаў пасьля выхаду нумару з матэрыяламі журналістаў «Белорусской деловой газеты». У Слоніме адмову матывуюць «недахопам магутнасьцяў». Хочацца дадаць: «...каб супрацьстаяць тэлефанаваньням «зьверху».

**Зьміцер Гурыновіч**, 21-гадовы грамадзянін Беларусі, разьбіўся насьмерць на атракцыёне «Катапульта» ў маскоўскім парку імя Горкага. Гэта ўжо другі выпадак паркавых трагедый сёлета. Пакуль гром ня грымне, страхоўкі не правяраюць.

**Сяргей Мікулевіч**

# Аляксандар Рар: «Шкада, што візыт Мартынава ў Нямеччыну адменены»

**Палітоляг Аляксандар Рар лічыцца ў Нямеччыне галоўным экспэртам па Беларусі, Расеі, Украіне. Ён узначальвае дасьледніцкі інстытут па пытаньнях СНД і Расеі пры няўрадавым Нямецкім таварыстве замежнае палітыкі. Яму 44 гады, ён немец расейскага паходжаньня. Нарадзіўся ў Тайпэі на Тайвані. Сябе ён называе «прадуктам белагвардзейскае эміграцыі»: ягоны дзед быў ад'ютантам генэрала Ўрангеля. Расея — галоўная тэма дасьледаваньняў Рара, астатнія краіны СНД — толькі даважак. Інтэрвію «НН» ён даў у прысутнасьці... Пуціна. Так завуць камічнага кокер-спаніеля нямецкага палітоляга. Сваім імем ён абавязаны моманту нараджэньня — Рар акурат пісаў поўную камплімэнтаў кнігу пра расейскага прэзыдэнта «Немец у Крамлі». Сапраўднаму Пуціну кніга быццам бы спадабалася. Рар працаваў у дасьледніцкім інстытуце радыё «Свабодная Эўропа/Радыё Свабода», кансультантам амэрыканскага мазгавога цэнтру «RAND Corporation», дарадцам генсака Рады Эўропы. Сярод профіляў сваёй дзейнасьці Рар таксама называе «палітычнае кансультаваньне». З 1994 г. ён працуе ў Нямецкім таварыстве замежнае палітыкі, дзе за год узначаліў Кербэр-аддзяленьне (СНД і Расея). Асабіста знаёмы з Пуціным і Кучмам.**



**«НН»: Як глядзіць Нямеччына на жаданьне Аляксандра Лукашэнкі зьмяніць Канстытуцыю з тым, каб магчы балятавацца на трэці прэзыдэнцкі тэрмін?**

**Аляксандар Рар:** Усё больш нэгатыўна. Няма ніякіх кантактаў з афіцыйнымі беларускімі палітыкамі, беларускае кіраўніцтва і Лукашэнка ня робяць ніякіх высілкаў, каб зблізіцца зь Нямеччынай і Эўрапейскім Зьвязам. Антыдэмакратычныя плыні ўнутры ўраду Лукашэнкі даюцца ў знакі нямецкім палітыкам.

**«НН»: Пры якіх абставінах у Беларусі магчымыя палітычныя зьмены? І ці можна разьлічваць на такія зьмены ў бліжэйшыя 10—20 гадоў?**

**А.Р.:** Беларусь ведала і іншыя часы. Нельга забываць, што адразу пасьля развалу Савецкага Саюзу Беларусь належала да самых дэмакратычных рэспублік на постсавецкай прасторы. Таму нельга губляць надзею на тое, што Беларусь калі-небудзь стане ў шэраг іншых сярэдне- і ўсходнеэўрапейскіх дзяржаваў, якія сапраўды імкнуцца да дэмакратыі і рынкавай эканомікі. У Беларусі ёсьць апазыцыя, калі-небудзь яна стане дастаткова моцнай для таго, каб выставіць моцнага адзінага кандыдата супраць Лукашэнкі альбо парлямэнцкім шляхам прымусіць яго да абмежаваньня сваіх функцыяў. Я думаю, гэта цалкам магчыма: Беларусь не знаходзіцца ў ізаляцыі, яе акаляюць нашмат больш дэмакратычныя краіны, нават у Расеі ідзе дэмакратычны працэс, і Лукашэнка ў сваім жаданьні застацца пры ўладзе ня можа больш разьлічваць на Пуціна. Таму мне здаецца, што і ў Беларусі адбудзецца паварот да дэмакратыі.

**«НН»: Ці можа гэты паварот адбыцца ўжо на наступных прэзыдэнцкіх выбарах?**

**А.Р.:** Пакуль яшчэ рана аб гэтым казаць, але ў Беларусі да Лукашэнкі ставяцца ўсё больш крытычна, апазыцыя яго не трывае, і калі будзе альтэрнатыўны яму кандыдат, дастаткова папулярны, які атрымае падтрымку ўсіх апазыцыйных сілаў, тады Лукашэнка будзе мець праблемы.

**«НН»: Як вы ацэньваеце першыя вынікі працы новага офісу АБСЭ ў Менску?**

**А.Р.:** Я думаю, што цалкам пазытыўны аспэкт — офіс больш не фігуруе на першых палосах газэтаў, няма ніякай асабістай варажнечы паміж кіраўніком офісу і дзяржаўнымі органамі ў Менску. Гэта вялікая перавага, хоць так яно і павінна быць. Тое, што СМІ пішуць пра працу, а не пра асабістыя сваркі адказных асобаў, можа пазытыўна паўплываць на той працэс, які АБСЭ вядзе ў Менску.

**«НН»: Нядаўна Кангрэс ЗША прыняў «Акт аб дэмакратыі ў Беларусі». Як ставіцца да гэтага дакумэнту Эўропа? Магчыма, ЭЗ больш талерантна глядзіць на беларускае кіраўніцтва?**

**А.Р.:** Не, пра талеранцыю казаць нельга. Зь іншага боку, мы хочам, каб амэрыканцы, калі яны падтрымліваюць дэмакратыю ва Ўсходняй Эўропе, рабілі гэта рука ў руку з Эўрапейскім Зьвязам. Каб узгаднялі свае дзеяньні з эўрапейскімі інстытуцыямі, а не рабілі нешта за сьпінай у эўрапейцаў, што пасьля ўся Эўропа будзе расхлёбваць. Тым больш што мэты ЭЗ не разыходзяцца з мэтамі амэрыканцаў: у Беларусі мусіць быць пабудаваная дэмакратыя і рынкавая эканоміка, як у іншых цэнтральнаэўрапейскіх краінах. У гэтай сувязі вельмі шкада, што тры тыдні таму быў адменены візыт беларускага міністра замежных справаў у Нямеччыну. Дый расейскае кіраўніцтва, я думаю, нягледзячы на аўтарытарныя тэндэнцыі ў Расеі, таксама зацікаўлена ў дэмакратызацыі Беларусі, а не ў ізаляцыі гэтай краіны.

> Я б не параўноўваў Лукашэнкі з Назарбаевым.

**«НН»: А што вы можаце сказаць пра сапсаваныя адносіны Беларусі з Расеяй? Ці спрыяе гэта яшчэ большай ізаляцыі Беларусі? І ці можа «саюзная дзяржава» стаць шляхам у эўрапейскую супольнасьць?**

**А.Р.:** У эўрапейскую супольнасьць вядуць шмат шляхоў. Ёсьць шляхі разам з эўрапейскай супольнасьцю. Эўразьвяз пашырыўся вельмі далёка на ўсход. Цяпер у сталіцах Старога Сьвету абмяркоўваецца пытаньне: ці можа ЭЗ сабе ўвогуле дазволіць далейшае пашырэньне на Ўсход у бліжэйшыя дваццаць гадоў? Альбо трэба зрабіць большы перапынак, перапынак у адну палітычную генэрацыю, і заняцца кансалідацыяй Новай Эўропы? Але гэта значыць, што такія дзяржавы, як Беларусь, Расея і Ўкраіна, сутыкнуцца зь іншай эўрапейскай стратэгіяй, менавіта — з стратэгіяй наўпростага суседзтва. Яна толькі вынаходзіцца, выпрацоўваецца, і трэба яшчэ запытацца гэтыя краіны пра іх патрэбы. Калі, згодна з жаданьнем палітычных элітаў, а ў першую чаргу — насельніцтва, будзе ўтвораны беларуска-расейскі саюз — для ЭЗ ня станецца праблемай наладзіць зь ім кантакты. Але я думаю, калі раптам вашая краіна сапраўды павернецца радыкальна на шлях дэмакратыі, як у 1991 г. пры Шушкевічу, Эўразьвяз яшчэ мацней падтрымае Беларусь.

**«НН»: Што значаць тады словы Бэрлюсконі пра неабходнасьць уступленьня ў Эўразьвяз Беларусі, Расеі і Ўкраіны — гэта выпадковая заява, рэклямны ход ці нешта яшчэ?**

**А.Р.:** Бэрлюсконі мае абсалютны іншае бачаньне Эўропы, чым Нямеччына і Францыя. Бэрлюсконі спрабуе сябе ў ролі новага вялікага эўрапейскага геапалітыка. Гэта нешта абсалютна сьвежае, калі італьянскі палітык гаворыць пра будучую Вялікую Эўропу. Але ёсьць і іншыя выказваньні Бэрлюсконі аб тым, што трэба прыняць паўночнаафрыканскія краіны ў адзіную эканамічную зону з Эўропай, Расеяй, іншымі краінамі. Падобныя мары ўзьнікаюць у Вашынгтоне. Бэрлюсконі гаворыць таксама пра Ізраіль як пра сябра такой зоны свабоднага гандлю, што, магчыма, праз пяцьдзясят гадоў будзе ўяўляць зь сябе нейкі саюз. Гэта сьвежая думка, трэба аб гэтым разважаць, але гэта ўжо вялікая палітыка.

**«НН»: Ці мусіць Польшча альбо балтыйскія краіны ў пэўнай ступені ўзяць на сябе адказнасьць за ўсходніх суседзяў і «прабіваць» трансфармацыйныя працэсы ў нашых краінах?**

**А.Р.:** Гэта вельмі важнае пытаньне. Я думаю, што эліты ў балтыйскіх краінах і ў Польшчы яшчэ ня вырашылі, як яны павінны сябе паводзіць. У іх усё яшчэ вельмі моцныя антырасейскія рэфлексы, многія хацелі б адвярнуцца ад былога «вялікага брата», «акупанта», што гістарычна і псыхалягічна зразумела, але не адпавядае вялікай эўрапейскай палітыцы. Таму задача такіх краінаў, як Нямеччына, — патрабаваць ад Польшчы і ад балтыйскіх краінаў канструктыўнай усходняй палітыкі ў дачыненьні да Расеі, Беларусі і Ўкраіны. Брусэль будзе ўмешвацца ў замежныя справы Польшчы і балтыйскіх краінаў, бо ў Эўразьвязе мусіць праводзіцца супольная замежная палітыка і палітыка бясьпекі ў дачыненьні да ўсходнеславянскіх дзяржаваў і ў гэтай сытуацыі нам непатрэбныя канфлікты, заснаваныя на мінулым альбо на яго пераадоленьні.

**«НН»: У адным з інтэрвію Вы казалі, што Назарбаеў «разумее сваё грамадзтва», якое не прызнае заходніх дэмакратычных каштоўнасьцяў. Наколькі гэта праўдзіва ў дачыненьні да Лукашэнкі?**

**А.Р.:** Назарбаеў, я лічу, правільны прэзыдэнт для вялікай і цяжкай краіны ў гэтым пэрыядзе трансфармацыі. Што тычыцца Лукашэнкі, дык ён, прыйшоўшы да ўлады, скасаваў многія дэмакратычныя дасягненьні, зробленыя папярэднікамі. Я б не параўноўваў яго з Назарбаевым. Акрамя таго, я думаю, што Беларусь належыць да іншага культурнага кола — да эўрапейскага, і таму да беларускага прэзыдэнта трэба выстаўляць нашмат больш жорсткія меркі і патрабаваньні, чым да казахстанскага альбо ўзбэцкага. Гэтае параўнаньне неабгрунтаванае.

**«НН»: Чаму Беларусь і Нямеччына так мала супрацоўнічаюць у сфэры грамадзянскай супольнасьці пры такіх моцных эканамічных сувязях і інтарэсах Нямеччыны ў Беларусі?**

**«НН»:** Сапраўды, тут склалася крытычная сытуацыя. Я б мог уявіць, што пры адпаведных абставінах, калі Лукашэнка даў бы нейкі сыгнал, што зацікаўлены ў дыялёгу з Эўразьвязам, у зьменах у сваёй краіне, палітыка далучылася б да эканамічных сувязяў і стала б больш актыўна і гнутка працаваць зь Беларусяй. Але паколькі Лукашэнка сам блякуе працэс і гэтага дыялёгу папросту няма, нямецкая палітыка мусіць адступіць і трымацца брусэльскіх крытэраў. У старой Эўропе ёсьць вельмі-вельмі крытычныя меркаваньні наконт Беларусі, і іх будзе ўсё больш, калі і надалей тут будуць стрымліваццa дэмакратычныя працэсы.

**Гутарыла Вэраніка Дзядок**

# Мікалай Чаргінец турбуецца пра бясьпеку Эўропы

Афіцыйны Менск працягвае прарываць блякаду на «заходнім фронце», гуляючы на супярэчнасьцях між Эўразьвязам і ЗША. Такую выснову можна зрабіць з заяваў Мікалая Чаргінца, старшыні пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бясьпецы савету рэспублікі, агучаных 14 ліпеня на прэсавай канфэрэнцыі. «Людзі турбуюцца пра бясьпеку Эўропы», — кажа Чаргінец. Галоўную для яе небясьпеку ён бачыць у вайсковым першынстве ЗША, якія выдаткоўваюць на ўзбраеньне сваёй арміі на 11 млрд даляраў больш, чым усе краіны ЭЗ, разам узятыя. У той самы час Чаргінец запэўнівае, што захаваецца «шматвэктарнасьць палітыкі», а значыць, і кантакты з ЗША. Сам ён прызнаўся, што езьдзіў у Нью-Ёрк, дзе сустракаўся з палітыкамі з Вашынгтону.

Чаргінец заўважыў, што леташняя скандальная заява Лукашэнкі на тэму незаконнай міграцыі праз Беларусь на Захад была зробленая, каб на Захадзе зразумелі, «якую масу і праблему мы не дапускаем у Эўропу». Беларускія ўлады ўсё яшчэ спадзяюцца атрымаць заходнюю фінансавую дапамогу на ўмацаваньне мяжы з Эўразьвязам. Таму на восень заплянаванае правядзеньне ў Менску міжнароднай канфэрэнцыі, прысьвечанай праблеме незаконнай міграцыі.



IREX-PROMEDIA

# Сэрбалужычане бароняць нацыянальную школу

**Нямецкія ўлады зачынілі сэрбалужыцкую сярэднюю школу ў вёсцы Хрошчыцы каля Будзішына, што працавала стагодзьдзе. Чаму? Замала вучняў... Для сэрбалужычан, невялікай славянскай меншасьці ў Нямеччыне, гэта нацыянальная трагедыя. Параўнальная з атакаю «беларускіх» уладаў на Беларускі ліцэй.**



## Ахвяры нарматываў і дэмаграфіі

Сэрбалужычане — гэта славянскі народ, які спрадвеку жыве ў Лужыцы, што на ўсходзе Нямеччыны. У Верхняй Лужыцы, у навакольлі Будзішына (нямецкая назва Баўцэн), дамінуюць каталікі, у Ніжняй, вакол Хасебужу — пратэстанты. Іх гаворкі трохі розьняцца між сабой, але абодва дыялекты належаць да заходнеславянскай групы моваў.

Сэрбалужычанаў цяпер каля 60 тыс. чалавек, але ўсё менш іх жыве ў месцах кампактнага пражываньня, такіх, як Будзішынская акруга, у якой знаходзіцца Хрошчыца. Сэрбалужычане — адна зь некалькіх юрыдычна прызнаных у Нямеччыне нацыянальных меншасьцяў, што гарантуе ім абарону дзяржавы. Але, як прызнаюць улады, гарантыі гэтыя даволі неканкрэтныя. У канстытуцыі нямецкай зямлі Саксоніі ёсьць пункт пра абарону сэрбалужыцкай культуры і мовы, але няма нормы, якая б вызначала, колькі дзяцей як мінімум павінна быць у клясе сэрбалужыцкай школы.

Між тым, у Саксоніі на ўсе школы пашыраецца аднолькавыя нарматывы. Сярэдняя школа (ад пятай да дзясятай клясы) павінна мець у кожнай паралелі сама меней 40 дзяцей, зь якіх можна ўтварыць дзьве клясы па дваццаць чалавек. Для шасьці сярэдніх школ у Саксоніі было зроблена выключэньне, ім дазволілі мець усяго па 20 дзяцей на паралель. У Хрошчыцы ж яшчэ два гады таму ў пятую клясу запісаліся толькі 17 вучняў, у мінулым навучальным годзе — васьмёра, а на 2003/04 г. ледзьве набралася сямёра прэтэндэнтаў.

Чаму бракуе дзяцей? Ва Ўсходняй Германіі іх наагул нараджаецца менш, чым за часамі ГДР. Людзі або ўжо страцілі працу, або баяцца яе страціць і непакояцца, што ў іх ня хопіць сродкаў на ўтрыманьне дзіцяці. Пазачыняны яслі і садкі, таму жанчынам, якія хочуць працаваць, цяжэй сумясьціць работу зь сям'ёй. Маладыя кабеты нараджаюць дзяцей пазьней, чым у гэдээраўскія часы. А самае істотнае — маладыя пакідаюць усход у пошуках добрай адукацыі ці працы. Бязьлюдзеюць гарады і цэлыя рэгіёны, у тым ліку і Лужыца. Таму паўсюль ва Ўсходняй Германіі зачыняюцца школы. У Саксоніі толькі сёлета такі лёс напаткаў 90 установаў.

Але сэрбалужычан не супакойваюць гэтыя тлумачэньні. Яны лічаць, што нельга параўноўваць сытуацыю 80-мільённага нямецкага народу і 60-тысячнай меншасьці, для якой кожная зачыненая школа — неацэнная культурная страта. Бо кожная нацыянальная школа — гэта абсяг нацыянальнай моўнай прасторы.




## Гісторыя бунту

Жыхары Хрошчыцы ўжо тры гады таму даведаліся, што іхняя школа пад пагрозай. Міністэрства асьветы паведаміла ім, што пачынаючы з 2001/02 навучальнага году пяціклясьнікі маюць хадзіць у школу ў недалёкай Ральбіцы. У абедзьвюх школах навучаньне вядзецца выключна па-сэрбалужыцку, у той час як у іншых школах пануе дзьвюхмоўе.

Бацькі не зьбіраліся падпарадкоўвацца пастанове Дрэздэну. У жніўні 2001 г. у Хрошчыцы адбыўся першы бунт. На працягу трох тыдняў дзеці хадзілі ў мясцовую школу, а ўрокі бясплатна вялі настаўнікі-пэнсіянэры. У акцыю грамадзянскага непадпарадкаваньня ўключыўся сэрбалужыцкі пісьменьнік Юры Брзан. У адкрытым лісьце да міністра асьветы ён напісаў: «Памыляецеся, пане міністру: закрыцьцё хрошчыцкай школы тычыцца ня толькі вас і бацькоў 17 вучняў. Гэта праява стаўленьня немцаў да этнічнай меншасьці ва ўласнай краіне, да аўтахтоннай групы людзей, якая зь цягам часу зьменшылася да некалькіх дзясяткаў тысяч чалавек».

Акцыя скончылася нічым. Праз тры тыдні, калі міністэрства не задаволіла просьбаў вяскоўцаў, а адміністрацыйныя суды двух узроўняў прызналі рацыю Дрэздэну (што пастанова аб паступовым закрыцьці школы не парушае канстытуцыйнага права нацыянальнай меншасьці на абарону культуры), дзеці пачалі хадзіць у школу ў Ральбіцы. Годам пазьней, калі набор у пятую клясу зноў быў прызнаны немэтазгодным, бацькі абмежаваліся пісьмовым пратэстам. Сёлета хрошчыцкая сярэдняя школа ўшчыльную наблізілася да свайго канца.

## Сэрца перастане біцца

Закрыцьцё школы — шок для сэрбалужычанаў, бо Хрошчыца — гэта сэрца Верхняй Лужыцы. Тут яшчэ штодзённа гавораць роднай моваю. Школа ў вёсцы існуе больш за сто год, а будынак, у якім яна разьмешчаная, спраўляе сотую гадавіну налета. «Хрошчыца — гэта асаблівая традыцыя, традыцыя супраціўленьня нацыянальнаму заняпаду», — гаворыць Мануэла Шульмэ з таварыства пашырэньня сэрбалужыцкай мовы «Вітай». «За Гітлерам, — апавядае пані Шульмэ, — улады прыбралі са школы ўсе крыжы. У адказ бацькі вучняў прыйшлі ў школу і прыбралі ўсе павешаныя на месцы крыжоў партрэты Гітлера. Пасьля вайны тут аднавіла дзейнасьць забароненая Гітлерам сэрбалужыцкая арганізацыя «Дамавіна». Вёска была бяльмом на воку і ў камуністаў, бо ніхто з тутэйшых дзяцей не хадзіў на Югендвае — камуністычную цырымонію ўводзінаў у сьвет дарослых, якая мелася замяніць каталіцкае мірапамазаньне і пратэстанцкую канфірмацыю. Таму пісьменьнік Юры Брзан казаў ужо два гады таму, што пастанова ўлады аб закрыцьці школы сьведчыць толькі пра «новыя мэтады, хоць мэта застаецца старой».

Прэс-сакратар міністэрства запэўнівае, што ўлады не жадаюць зьнішчэньня культуры сэрбалужычанаў. Ён ня лічыць закрыцьцё школы ў Хрошчыцы «сур'ёзным ударам» для нацыянальнай меншасьці. Ральбіца знаходзіцца за некалькі кілямэтраў ад Хрошчыцы. Усяго ў Саксоніі налічваецца шэсьць сэрбалужыцкіх пачатковых школ і, пасьля закрыцьця ўстановы ў Хрошчыцы, пяць сярэдніх школ ды гімназія ў Будзішыне.

## Запозьнены пратэст

«Дамавіна» далучылася да пратэсту, але запозна. Некалькі дзён таму яе старшыня Нук напісаў ліст папу Яну Паўлу II, які наведваў Хрошчыцу ў 1975 годзе яшчэ кардыналам.

Ці спрабавалі лужычане ратаваць школу, напрыклад, пераводам яе на ўтрыманьне бацькоў ці «Дамавіны»? Так, але гэта мала рэальна, бо школа для нацыянальнай меншасьці ніколі ня будзе самаакупнай, а дзяржаўныя датацыі яна змагла б атрымаць толькі пасьля трох год існаваньня ў новым статусе. У «Дамавіны» няма грошай.

Бацькі абураныя і засмучаныя. Школа ў Ральбіцы перапоўненая. Да таго ж трэба плаціць 120 эўра штогод за падвоз дзяцей да новай школы. Таму некаторыя бацькі днямі вырашылі яшчэ раз зьвярнуцца ў суд. «Пад канец канікулаў стане вядома, ці будзе скарга разгледжана, — гаворыць Рэгіна Корэнк, прадстаўніца бацькоўскага камітэту. — Аплату судовай пошліны, па 700 эўра з вучня, на шчасьце, возьме на сябе «Дамавіна».






# Мэдычная рэформа ў Нямеччыне

**Урад і апазыцыя ўзгаднілі плян рэформы сыстэмы аховы здароўя. Ці ёсьць вартае пераймання для Беларусі?**

Больш за 140 млрд эўра штогод ідзе ў Нямеччыне на сыстэму аховы здароўя. І ўсё ж з году ў год бракуе сродкаў на лячэньне хворых і развіцьцё галіны, а дактары скардзяцца на малыя заробкі. Бо часта грошы трацяцца не на тое, на што трэба, дый грамадзтва старэе і патрабуе ўсё большай мэдычнай дапамогі.

Высокія ж выдаткі на мэдыцыну павялічваюць... беспрацоўе, бо складкі плацяць напалам работнікі і працадаўцы. Апошнім робіцца нявыгадна стварыць новыя працоўныя месцы. А за лячэньне беспрацоўных плаціць дзяржава, што таксама пагаршае яе эканамічнае становішча.

Мэта рэформы, праўдзеньне якой пасьля доўгіх перамоваў узгаднілі канцлер Шродэр і лідэрка апазыцыі Ангела Мэркель (варты пераймання ў Беларусі прыклад), — зьнізіць да 2007 г. выдаткі на мэдыцыну зь цяперашніх 14,4% да 13% бюджэту. Будуць пераразьмеркаваныя долі крыніцаў, якія фінансуюць мэдыцыну. Зьменшыцца доля «касы хворых», куды цэнтралізавана паступаюць зборы з работнікаў і працадаўцаў, а самі хворыя будуць плаціць болей.



**Міністарка аховы здароўя Нямеччыны Ула Шміт дзьвюма рукамі за рэформу.**

Будуць браць большыя грошы і за лекі, і за знаходжаньне ў бальніцы; нават за саму магчымасьць пайсьці да доктара давядзецца штоквартал выкладваць 10 эўра. Але ўся сума не павінна перавышаць 2% даходаў пацыента (ці 1% для хранічна хворых). Толькі дзецям і моладзі нічога плаціць ня трэба будзе. А дзяржаўныя дапамогі на нараджэньне дзіцяці ці на пахаваньне наагул адыдуць у нябыт.

Таксама рэформа лібэралізуе гандаль лекамі (іх можна будзе прадаваць нават праз Інтэрнэт), што аслабіць цяперашнюю манаполію аптэкаў і тым самым зьнізіць цэны на лекі.

СУРОДЗІЧЫ

# Марш паняволеных нацыяў

**Прадстаўнікі беларускай дыяспары ў ЗША ўзялі ўдзел у штогадовым «Маршы паняволеных нацый»**, які прайшоў 20 ліпеня ў Нью-Ёрку. Марш зьяўляецца першай падзеяй «Тыдня паняволеных нацый», у якім штогод, пачынаючы з 1959 г., удзельнічаюць прадстаўнікі дыяспар тых краінаў сьвету, дзе адсутнічае дэмакратыя, грамадзянскія свабоды і ўціскаецца правы нацый на самавызначэньне.

Мерапрыемства пачалося багаслужбаю за народы ў катэдральным саборы Сьвятога Патрыка, а сам марш прайшоў у цэнтры Нью-Ёрку — па 5-й авэню і 72-й вуліцы. У цэнтральным парку Нью-Ёрку адбылося афіцыйнае адкрыцьцё праграмы «Тыдня паняволеных нацый».

Нагадаем, што 18 ліпеня ў Даласе (Тэхас), беручы ўдзел у мерапрыемствах, прымеркаваных да «Тыдня паняволеных нацый», прэзыдэнт Джордж Буш заявіў, што Беларусь уваходзіць у лік шасьці краін з рэжымамі, што «ўціскаюць правы чалавека». У той «чорны сьпіс» таксама трапілі Бірма, Зымбабвэ, Іран, Куба і Паўночная Карэя.

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Франц Субель**

# Сюрпрызы й сьмерць на 14-м «Басовішчы»



Прызэры сёлета былі на любы густ. Хіп-хопавыя «IQ-48» зь Менску, арт-рокавая «Сьцяна», альтэрнатыўныя «Indigo» з жаночым вакалам. Пра апошні гурт у журы, якое гэтым разам складалася з музыкаў Славы Кораня й Аляксандра Памідорава ды журналістаў Вітаўта Мартыненкі й Лукаша Сьцепанюка, спрэчак увогуле не было. Захапілі сьвежая драйвавая музыка, прафэсіяналізм. (У «Indigo», між іншым, грае Лёша Паўловіч, які добры кавалак свайго жыцьця прысьвяціў «Улісу» ды «Новаму небу», вакалістка Руся таксама мае добрую школу. Сярод яе «ўнівэрсытэтаў» — сьпяваньне ў рэчыцкім начным клюбе.)

Ня горш за «Indigo» глядзелася й берасьцейская «Сьцяна». Яна прычаравала публіку і журы сваім саксафонам, што «заводзіў» ня горш ад электрагітары. Рэпэры «IQ-48» апошнім часам актыўна беларусізуюцца — заразьлівы прыклад украінскіх братоў з «Майдану Конга». Хлопцы — файныя мэлядысты, «Паветраны шар» (іх супольная праца зь «Нестандартным варыянтам») будзе адным з гітоў трыб’юту «NRM», які выйдзе неўзабаве. Традыцыйны прыз ад войта гміны Гарадка традыцыйна атрымаў гурт з Польшчы. Цікава, што «Triquetra» складаецца з «стопрацэнтных палякаў», якія, учуўшы пра «Басовішча», пераклалі пару сваіх песень на беларускую мову. Леташнія ж прызэры з «Partyzone» выступілі, паводле сьведчаньняў, неарганізавана: далася ў знакі колькасьць выпітага алькаголю. Праз гарэлку здарылася й сапраўдная трагедыя — патануў у стаўку гарадзенскі хлапец Іван Сырэль.

Калі б узнагароду на фэсьце давалі за найлепшае шоў, яе атрымаў бы гурт «Аніма», у складзе якога грала такая сабе беларуская сьмерць з гітараю замест касы. «Але лепш бы вакалістка меней гаварыла і болей сьпявала», — адзначае Вітаўт Мартыненка.

Хоць большасьць слухачоў па-ранейшаму спала ў намётах і пад зорным небам, а большасьць рокераў — у гарадоцкай школе на гімнастычных матах, але «ўганараваныя гатэлем» сёлета трапілі ў яго безь ніякіх праблемаў. За што арганізатарам шчыры дзякуй. На школу, дарэчы, пасьля «Басовішча» шкода глядзець: краны скручаныя, падлога вадой паліваная. Называецца, прыехалі госьці. Ды за адно гэта можна ў Эўразьвяз ня браць…

Імёны, адкрытыя сёлета на «Басовішчы», больш сюрпрызныя за леташнія. Не хацелася б, каб і яны зрабіліся «моднымі клюбнымі гуртамі», якіх па-за межамі тых клюбаў ніхто ня чуе. Праз год яны ў якасьці гасьцёў зайграюць на 15-м «Басовішчы», якое арганізатары абяцаюць зрабіць юбілейна-нетрадыцыйным. Там стане ясна, што з каго выйшла.

**Іван Няхведараў**

## Прызэры «Басовішча»




«Indigo» (Менск) — 20 гадзінаў запісу ў студыі радыё «Беласток»; узнагарода Зьвязу беларусаў Польшчы.
«IQ-482 (Менск) — узнагарода Беларускага аб’яднаньня студэнтаў.
«Сьцяна» (Берасьце) — узнагарода замежнае службы радыё «Палёнія».
«Triguetra» (Аструда) — узнагарода войта гміны Гарадка.

• У ПЭН-ЦЭНТРЫ •

# Праз два пакаленьні ўсе загавораць па–беларуску

**17 ліпеня ў Беларускім ПЭН-цэнтры адбыўся круглы стол, прысьвечаны праблеме наяўнасьці двух варыянтаў правапісу («наркамаўкі» ды «тарашкевіцы») і функцыянальнасьці беларускай мовы. Удзел у ім узялі доктар Ян Запруднік (Нью-Ёрк), прафэсар Генадзь Цыхун, галоўны рэдактар выдавецтва «Тэхналёгія» Зьміцер Санько, рэдактар газэты «Салідарнасьць» Аляксандар Старыкевіч, кандыдат філялягічных навук Юрась Бушлякоў, гісторык Алесь Белы, рэдактар часопісу «Arche» Валер Булгакаў і інш.**

У існаваньні двух варыянтаў правапісу, зазначыў Г.Цыхун, няма нічога страшнага: ёсьць краіны, дзе суіснуюць некалькі літаратурных моваў, ня тое што варыянтаў. І дзяржаўнае ўмяшаньне ці спроба гвалтоўнага вырашэньня праблемы не дадуць тут плёну. Іншая рэч, што ўсё гэта вядзе да ўскладненьня моўнай сытуацыі, у выніку чаго абывацель выбірае «просты варыянт» — пераходзіць на расейскую. Ю.Бушлякоў акцэнтаваў увагу на тым, што ў Беларусі ўсё ж існуе адна літаратурная мова і дзьве правапісныя традыцыі. Выбар той ці іншай традыцыі не такі істотны, як уласна чысьціня мовы.

А.Старыкевіч выказаў упэўненасьць, што правапісны разнабой не перашкаджае беларусізацыі: «З тым самым посьпехам можна сьцьвярджаць, што бел-чырвона-белы сьцяг разбурае дзяржаву». А набыткі першай паловы 90-х можна хутка адны навіць пры зьмене дзяржаўнага курсу.

Поруч з двума варыянтамі правапісу, заўважыў Я.Запруднік, існуе разнабой і ў «тарашкевіцы». Неабходны звод правілаў, які ўніфікаваў бы розныя прыватныя варыянты. Але пры гэтым ня варта зь непавагай ставіцца да носьбітаў «наркамаўкі»: «Сёньня лепей мець чалавека, які піша «наркамаўкай», чым русіфікаванага».

В.Булгакаў наракаў, што ідэолягі абодвух варыянтаў правапісу не кантактуюць міжсобку: «Пазыцыі абсалютызуюцца абодвума бакамі: людзям здаецца, што яны валодаюць ісьцінай у апошняй інстанцыі». На што запярэчыў Г.Цыхун, прывёўшы прыклады дыфузіі абодвух варыянтаў, лексычных, марфалягічных ды іншых новаўвядзеньняў у «афіцыйны» варыянт мовы.

Насуперак цьверджаньням бальшыні А.Белы зазначыў, што нельга казаць адназначна пра маргіналізацыю беларускай мовы: «Па радыё цяпер значна болей, чым раней, чуваць песьні па-беларуску. Гэты трэнд у процілеглы бок таксама існуе, і яго нельга не заўважаць». Я.Запруднік зьвярнуў увагу на тое, што цяпер падрастае новае пакаленьне грамадзянаў Беларусі — людзей, якія вырасьлі ўжо ў новай дзяржаве: «Гэта пакаленьне палітычна сьведамых беларусаў, нават калі яны і расейскамоўныя. Але і расейскамоўны беларус будзе іншым праз два пакаленьні».

Поўная стэнаграма «круглага стала» будзе выдрукаваная ў жнівеньскім нумары часопісу «Arche».

**Аркадзь Шанскі**

# Людзі ставяць помнікі

**У Беларускім ліцэі разгром, пакінула FM-дыяпазон беларускамоўнае радыё «Сталіца», у адзінай беларускамоўнай школе Глыбокага ўвялі расейскую клясу, доля беларускамоўнага вяшчаньня на БТ зьнізілася з 10% у 2000 г. да 8% сёлета… Але гэтыя ганебныя для ўладаў факты толькі ўмацоўваюць простых людзей-беларусаў у любові да сваёй культуры, мовы, памятак — таго, што ніхто ў сьвеце не зьберажэ бяз нас. Каб зьберагчы памяць, людзі ставяць помнікі.**



Адам Глёбус і Міраслаў Адамчык адкрываюць мэмарыяльную шыльду Вячаслава Адамчыка

Так паўсталі сотні крыжоў у Курапатах. Так цяпер зьявіўся помнік Купалу ў Глыбокім, у Менску адкрытыя мэмарыяльная шыльда Вячаслава Адамчыка, на Ўсходніх могілах Менску зьявілася памятка па Ўладзімеру Кармілкіну.

Апошнюю стварыў скульптар Алесь Шатэрнік. Ужо год мінуў з дня сьмерці фатографа, а яго вялізны архіў усё яшчэ сыстэматызуецца. Там хопіць матэрыялу на цэлы летапіс беларускага дэмакратычнага руху. Мяркуецца таксама ўкласьці альбом, прысьвечаны журналісту, — гэта будзе яшчэ адзін помнік яму.




Адзін з найстарэйшых беларусаў Масквы Антон Сабалеўскі падараваў свайму роднаму Глыбокаму 80-сантымэтровы помнік Купалу. З гэтым эскізам скульптар Валяр’ян Янушкевіч браў удзел у конкурсе, пераможца якога атрымаў замову на помнік Купалу ў Маскве і фінансаваньне свайго праекту з «саюзнага» бюджэту. Перамог скульптар Гумілеўскі. Працу ж Янушкевіча выкупілі маскоўскія беларусы. Спачатку Купалу меркавалі пакінуць у тамтэйшым цэнтры беларускай культуры на Арбаце, але пасьля вырашылі завезьці ў Глыбокае, у гісторыка-этнаграфічны музэй. «Тут наша, беларуская зямля. Купалу тут будзе ўтульней, а нам, хто задумаў і стварaў гэты твор, — весялей на душы», — казаў А.Сабалеўскі.

Працу скульптара Паўла Вайніцкага, аўтара шыльды памяці Адамчыка, уфундавалі сыны пісьменьніка. А Міністэрства культуры? Абяцае кампэнсаваць выдаткі, «калі будуць грошы».

**ЮК, МБ**



Антон Сабалеўскі падараваў Глыбокаму 80-сантымэтровы помнік Я.Купалу

## Як скрасьці танк

**Гучныя скандалы вакол продажу зброі тым, каму і рыдлёўку ў рукі даваць страшнавата, не пакінулі абыякавымі нашых суайчыньнікаў.** Самыя прадпрымальныя зь іх узялі апісаныя прэсай выпадкі за прыклад. Аднак на дробязі, кшталту прылад начнога бачаньня, ніхто не разьменьваецца: апошні піск мілітарнае моды — танк часоў вайны. Адзін зь іх, нямецкае вытворчасьці, нядаўна выявілі ў вёсцы Ермаловічы (Бялыніччына). Шукалі яго год. Машына была часткаю мэмарыялу «Буйніцкае поле», пакуль 43-гадовы жыхар Гарадзеншчыны не прырабіў ёй ногі. Падазраваны ж цьвердзіць, што скраў танк не на продаж, а для аднае кінастудыі ў якасьці рэквізыту. Доўга ж ён ехаў на кінастудыю.

Але зьвезьці танк, які стаіць у полі, хай сабе й Буйніцкім, нескладана. Вось жыхары Дуброўна, што на Віцебшчыне, не шукалі лёгкіх шляхоў. Матэрыяльная каштоўнасьць дзяржавы (а менавіта такі статус мае танк часоў вайны), якую яны вырашылі прысвоіць, захоўвалася ў балоце ля вёскі Казлы. Адтуль яе, паводле вэрсіі сьледзтва, выцягнулі ды прадалі расейскім перакупнікам мэталаў. Падсьледныя пярэчаць: танк не выцягвалі, толькі асобныя часткі...

Прыклады заразьлівыя. Відаць, хутка давядзецца пільнаваць «асобныя часткі» трыццацьчацьвёрак, што стаяць на пастамэнтах па ўсёй краіне. Якраз і лукамольцам будзе работа.

**Пятро Дарашонак, Чэрвень**

## Сакрэты посьпеху газэты

**На асаблівым кантролі ў раёне знаходзіцца падпіска на газэту «Советская Белоруссия».** Каб выканаць плян, кожнаму супрацоўніку пошты даводзіцца выпісваць «СБ» і для сябе. Апроч таго, выканкам з дапамогай паштароў сочыць, што чытаюць кіраўнікі арганізацый раёну.

**Сяргей Станкевіч, Дрыбін**

## Zastrelili ŭ aŭtobusie

**U paniadziełak a 7-j ranicy ŭ baranavickim rejsavym aŭtobusie №12 byŭ zabity čałaviek.** Pavodle śviedčańnia pasažyraŭ, na vulicy Telmana ŭ aŭtobus-«harmonik» uvajšli troje mužčynaŭ i padyšli da čałavieka, jaki siadzieŭ zzadu. Pra niešta krychu ź jim pahutaryli, a potym adzin dastaŭ nievialiki pistalet z hłušakom i try razy streliŭ. Druhi nietaropka sabraŭ hilzy. Paśla zabojcy vyjšli z salonu... Zatrymać ich nichto z pasažyraŭ nie advažyŭsia (navat były milicyjant, jaki tam jechaŭ), a milicyja nia zdoleła adsačyć zabojcaŭ. Ciapier apytvajucca śviedki złačynstva. Zabojstva ŭzrušyła Baranavičy. Ludzi zdumać nia mohuć — za što zahinuŭ čałaviek. Milicyja ž pakul maŭčyć.

**Rusłan Raviaka, Baranavičy**

## Кабульскі фатограф

**Арыгінальны мэтад барацьбы з алькагалізмам прыдумаў старшыня Кабульскага сельсавету.** Гэты спадар без дазволу грамадзян заходзіць у хату, дзе, на ягоную думку, ёсьць нецьвярозыя, і фатаграфуе іх. Тут ёсьць нюанс. З этычных меркаваньняў недапушчальна фатаграфаваць людзей у непрывабным стане і тым болей неяк карыстацца такімі здымкамі. Дый марна ўсё гэта. Калі дзяржава бярэ на сябе абавязак спойваць грамадзян моцнымі напоямі, то чым жа ёй можна супраціўляцца. Зараз выручка ад алькаголю складае ў нашых крамах каля 60% ад усёй выручкі.

**«Дуброўскі настрой», лісток зь вёскі Дуброва Сьветлагорскага раёну**

## ХРОНІКА ЎЦІСКУ

**24 чэрвеня ў Віцебску падчас жалобнай акцыі, прысьвечанай памяці Васіля Быкава, былі затрыманыя актывісты КХП-БНФ Ян Таўпыга** і **Барыс Хамайда**, якія трымалі бел-чырвона-белы сьцяг з чорнай стужкай і партрэт Быкава. Судзьдзя спн.Жураўкова палічыла, што яны ладзілі несанкцыяваны пікет, і патлумачыла: па дазвол на акцыю памяці Быкава арганізатары мусілі зьвярнуцца загадзя — за 15 дзён. Б.Хамайда і Я.Таўпыга атрымалі судовае папярэджаньне. Сябра віцебскай суполкі КХП-БНФ **Аляксандар Салаўян** 1 ліпеня атрымаў судовыя пастановы за апошнія 5 месяцаў. Паводле іх, ён быў тройчы аштрафаваны за несанкцыяваныя пікеты на агульную суму 6.195.000 руб., хоць на два з трох судоў апазыцыянэр не атрымліваў нават пазовы. Апрача таго, 11 ліпеня А.Салаўян і **Ўладзімер Плешчанка** былі аштрафаваныя на 160 базавых велічыняў (2 млн 200 тыс.) за збор подпісаў супраць Саюзнай дамовы. 2 ліпеня **Юры Хадыка** быў аштрафаваны за «непавагу да суду» на 14.000 рублёў. Актывістка незарэгістраванага руху «Зубр» **Тацяна Ялавая** 8 ліпеня паўторна была завочна асуджаная на 10 сутак арышту за ўдзел у акцыі «Далоў тыранаў». 22 ліпеня Т.Ялавая падала скаргу ў Менскі гарадзкі суд з просьбай адмяніць прысуд дзеля сканчэньня тэрміну даўнасьці. Рэдактар зачыненай аршанскай газэты «Куцейна» **Віктар Андрэеў** атрымаў 8 ліпеня выканаўчыя судовыя лісты пра два штрафы. Першы (5000 руб.) — за знаходжаньне ў арандаванай пад офіс кватэры без прапіскі. Другі (200 тыс. руб.) датуецца аж 2001 г.: яшчэ падчас прэзыдэнцкае кампаніі В.Андрэеў быў асуджаны за нібыта «незаконнае прадпрымальніцтва», а газэта «Куцейна» ў выніку спыніла існаваньне. Лейтэнанты міліцыі Кулажкін і Стамброўскі 9 ліпеня ўварваліся бяз ордэру ў жытло дэпутаткі Круглянскага райсавету **Зінаіды Мялешчанкі**: шукалі дакумэнты, зьвязаныя зь ейнай дэпутацкай дзейнасьцю. Апрача таго, жанчыну зьбілі. Дэпутатка аднесла скаргу ў пракуратуру. За ўдзел у акцыі «Хочам ведаць праўду» 16 ліпеня былі асуджаныя сябры віцебскай арганізацыі АГП: 17 ліпеня **Руслан Голубеў** — на 2 сутак арышту, 21 ліпеня **Эаніта Жаўняровіч** і **Фёдар Бакуноў** атрымалі судовае папярэджаньне. У Барысаве 17 ліпеня падчас раздачы ўлётак у абарону вайсковага шпіталю, які зачыняюць улады, быў затрыманы «зубровец» **Андрэй Драздовіч**: у міліцыі ад яго патрабавалі напісаць тлумачальную запіску, пасьля чаго адпусьцілі.

**АШ**

IN MEMORIAM

# Фатограф Палесься

**11 ліпеня ў Лодзі памёр фатограф Палесься Юзаф Шыманчык. Было яму 94 гады. І хоць большую частку свайго жыцьця (ад 1945 г.) ён пражыў у Польшчы, ягоныя цесныя сувязі з Палесьсем, адкуль ён паходзіў, не перарываліся.**

Юзаф Шыманчык нарадзіўся ў 1909 г. у Косаве, што на Берасьцейшчыне. Ён рана страціў бацькоў, таму з маладых гадоў мусіў сам зарабляць на жыцьцё. Зьведаў нягоды, голад і няпэўнасьць. Але ня здаўся. Прыроджаная энэргічнасьць, аптымізм і заўсёдная цікавасьць да сьвету дапамаглі яму выкарыстаць шчасьлівы шанец, якім была сустрэча з Барысам Кацэнам, лясьнічым у маёнтку Мерачоўшчына, аматарам фатаграфіі. Той дазволіў маладому сялянскаму хлопцу назіраць, як ствараюцца здымкі. Зачараваны гэтым працэсам, кіраваны вялікай рашучасьцю самавукі, Шыманчык навучыўся фатаграфаваць. Гэта зьмяніла ягонае жыцьцё.

Дарога да ўласнай фатастудыі ў доме ля косаўскага рынку каштавала яму многіх ахвяраў і гадоў цяжкай працы. Шыманчык быў сэзонным фатографам у Івацэвічах, Целяханах і Лагішыне, кіраваў сьціплай фотамайстэрняй, арандуючы памяшканьне ў Косаве, і нарэшце займеў уласную справу. Пасьпяховы прафэсійны рост перарвала вайна. Пасьля прыходу саветаў Шыманчыкава прадпрыемства было пераўтворана ў арцель, на чале якой стаў прызначаны ўладамі прыежджы камуніст. Гады нямецкай акупацыі Юзаф правёў у Слоніме, куды вымушаны быў пераехаць з Косава, дзе надта ж даймалі партызаны. Пасьля вайны ён вырашыў зьехаць у Польшчу, бо ўсьведамляў, што ў савецкай дзяржаве ня здолее захаваць самастойнасьць. Пасяліўся ў Кутне, дзе да 1985 г. трымаў уласную фатастудыю і рабіў фотазанатоўкі грамадзка-культурнага жыцьця. Астатнія амаль 20 гадоў жыцьця Шыманчык правёў у Лодзі.

Ён быў ня толькі прафэсійным фатографам, але й рэпарцёрам-дакумэнталістам, фотамастаком. Займеўшы фотаапарат, ужо не выпускаў яго з рук. Ён фіксаваў на плаcьцінках усе найважнейшыя падзеі з жыцьця Косава і ваколіцаў: урачыстасьці і сходы ў доме культуры, выступы аматарскіх тэатраў, школьныя імпрэзы, парады, мэліярацыйныя мерапрыемствы. Фатаграфаваў помнікі найбліжэйшых вёсак і мястэчак: сядзібу Тадэвуша Касьцюшкі і палац Пуслоўскіх у Мерачоўшчыне, палац Сапегаў у Ружанах. Сабраў архіў зь некалькіх тысяч здымкаў, якія, на жаль, не перажылі вайны. Выпадкова захавалася толькі найкаштоўнейшая яго частка — каля 400 мастацкіх фатаграфій, на якіх адлюстраванае штодзённае жыцьцё жыхароў палескіх вёсак, і пад сто здымкаў з жыцьця Слоніму пад нямецкай акупацыяй.



Юзаф Шыманчык

Этнаграфічныя фатаграфіі Палесься пан Юзаф пачаў рабіць пад уплывам «айчыннай фатаграфіі» Яна Булгака і ягонага заклiку фіксаваць тое, што зьнікае. У 1936 і 1937 г. Шыманчык зьдзейсьніў некалькі вандровак на роварах у далёкія вёскі на Белым, Чорным і Спораўскім азёрах. Ён увекавечыў на пласьцінках краявіды, будынкі і ў першую чаргу — жыхароў тамтэйшых вёсак. Здымаў людзей падчас працы ў полі, у двары, на рацэ, падчас малітвы ў царкве, у размове і адпачынку. З найлепшых кадраў ён вырабіў паштоўкі, якія можна было купіць у ягонай студыі ў Косаве і на палескіх кірмашах у Пінску. Так яны распаўсюджваліся ў перадваеннай Польшчы, робячыся — поруч з паштоўкамі Соф'і Хамянтоўскай ды С.Гохмана — візытоўкай і своеасаблівай рэклямай Палесься.

Апошнія два гады жыцьця Юзаф Шыманчык прысьвяціў клопату пра тое, каб ягоны палескі архіў быў больш вядомы і даступны. Ён перадаў свае здымкі ў некалькі музэяў Польшчы, удзельнічаў у фотавыставах, атрымліваючы на іх узнагароды. Польскае тэлебачаньне зьняло пра яго дакумэнтальны фільм «Чары Палесься».

Пан Юзаф неаднаразова прыяжджаў у Беларусь. Ён падараваў калекцыю сваіх фатаздымкаў Палесься Акадэміі навук, а таксама музэям у Бярозе ды Івацэвічах, вазіў яе ў Косава. Я была сьведкай яго апошняй паездкі на Палесьсе і бачыла, зь якім хваляваньнем ён аглядаў этнаграфічную экспазыцыю ў музэі Бярозы, упрыгожаную ягонымі павялічанымі фатаграфіямі, сустракаўся зь людзьмі ў Лісічыцах, Стрыгіне, Зьдзітаве і Спораве. Некаторыя памяталі, як перад вайной іх наведваў фатограф. Была нават сустрэча — праз 60 гадоў! — з героем аднаго здымка: Мікалай Хмялеўскі зь Лісічыц выдатна памятаў візыт фатографа, хоць і быў тады маленькім хлопчыкам. Падчас тае вандроўкі быў зьняты фільм «Фатограф Палесься» (рэжысэр Анджэй Ружыцкі) — фільм, які прымушае задумацца над тым, што мінае, і над тым, што застаецца.

Пан Юзаф заставаўся верны свайму краю і свайму пакліканьню. Ён памятаў ды клапаціўся пра тое, каб і іншыя памяталі. Жадаў ён і каб помнілі аб ім.

**Ганна Энгелькінг, Варшава**



**Ю.Шыманчык на фатаздымках адлюстраваў штодзённае жыцьцё сваіх землякоў.**

# Памёр Аляксандар Катляроў

**Уночы з суботы на нядзелю Беларусь страціла Аляксандра Катлярова.** Сп.Аляксандар заснаваў і ўзначальваў слуцкі клюб выбаршчыкаў, цэнтар прававой асьветы, сацыяльна-культурнае аб'яднаньне «Золак», зь якім зьвязваў шмат плянаў. На жаль, Аляксандра ўжо няма з намі. Пайшоў ён у 61 год. Смуткую разам зь ягонай сям'ёй.

**Сябар-случчак**

# Станіслаў Шушкевіч:
# Саюзны дагавор — марнаваньне часу

Першы кіраўнік незалежнай Беларусі адказвае на пытаньні карэспандэнта «НН».




**НН: Ці згодныя Вы з параўнаньнем Дэклярацыі 1990-га з устаўнымі граматамі Рады БНР 1918 г.?**

**Станіслаў Шушкевіч:** Лепей не параўноўваць. У часы БНР гэта было ўпершыню і было больш важка. А ў нас ужо была пракладзеная дарога — устаўныя граматы Рады БНР. Мы былі іх наступнікамі.

**«НН»: Ці ўсьведамляла намэнклятура, галасуючы за дзяржаўны сувэрэнітэт Беларусі, што тым самым набліжае нашу краіну да незалежнасьці?**

**С.Ш.:** Намэнклятура лепш чым хто ўсьведамляла гэта. Але гэтага не ўсьведамляў БНФ, дэпутаты якога выйшлі з залі і не галасавалі за Дэклярацыю. Як бы цяпер гэта ні тлумачылася тактычным крокам, гэта ўсё глупства. Яны выйшлі, бо хацелі прыняць іншы дакумэнт, а цяпер больш за ўсіх ганарацца Дэклярацыяй. Больш таго, калі Вярхоўны Савет зацьвярджаў Белавескія пагадненьні, дэпутаты БНФ зноў бачылі ў іх новы варыянт саюзнага дагавору...

Чаму наша самая «савецкасаюзная» намэнклятура дружна галасавала за сувэрэнітэт? Таму што падобныя дэклярацыі ўжо былі прынятыя ў Расеі і ў большасьці астатніх саюзных рэспублік. Інакш дзейнічаць было нельга. Гэта была іх адзіная матывацыя. І зьмест дакумэнту, я лічу, атрымаўся добры. Згадку пра работу над саюзным дагаворам, супраць чаго пратэставалі бээнэфаўцы, трэба было прыняць. Ужо тады было зразумела, як і цяпер, што ўсе гэтыя размовы пра саюзны дагавор — марнаваньне часу. Тады ён мусіў памерці і цяпер памрэ.

**«НН»: Вы лічыце, што курс фракцыі БНФ у Вярхоўным Савеце на поўную дзяржаўную незалежнасьць Беларусі ў 1990 г. быў перадчасным?**

**С.Ш.:** У іх была максымалісцкая пазыцыя — незалежнасьць і ўсё! Але для Беларусі тады гэта быў бы занадта рашучы крок. Нельга абсалютызаваць падыходы ў краіне, дзе максымум 22% людзей больш-менш ведаюць беларускую гісторыю. Кожны пяты і толькі! Патрэбны былі паступовыя крокі, кампрамісы, у тым ліку і з намэнклятурай. У нас, аднак, у адрозьненьне ад іншых былых савецкіх рэспублікаў, такога кампрамісу не адбылося.

**«НН»: Цяпер склалася сытуацыя, калі Дзень Незалежнасьці сьвяткуецца ў розныя дні...**

**С.Ш.:** Я бачу знарок зробленую блытаніну. 3 ліпеня — гэта дзень вызваленьня Менску ад фашысцкай акупацыі, і да беларускай незалежнасьці гэты дзень ня мае ніякага дачыненьня. Гэта — пацьверджаньне колішняга знаходжаньня Беларусі ў Савецкім Саюзе і ўкладу беларусаў у яго вызваленьне ад фашысцкай навалы. Я вельмі часта задумваўся над пытаньнем, калі ж трэба сьвяткаваць Дзень Незалежнасьці Беларусі. І прыйшоў да высновы, што 25 сакавіка. Другім па значнасьці я лічу 27 ліпеня.

**Запісаў Сяргей Ёрш**

### Незалежнасьць па-дзямянцееўску

Першапачатковы варыянт Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларускай ССР быў прапанаваны старшынём ВС Мікалаем Дзямянцеем ад імя ЦК КПБ. Тэкст утрымліваў 38 пунктаў, адзначаў «вядучую ролю кампартыі» і іншыя падобныя рэчы. Менавіта гэты дакумэнт і быў узяты за аснову. Пасьля яго дапрацоўкі ў Дэклярацыі засталіся 12 пунктаў, на якія пагадзілася партыйна-савецкая намэнклятура.

# Адзінаццаць абліччаў незалежнасьці

## Хроніка сьвяткаваньня 27 ліпеня




**Упершыню Дзень Незалежнасьці 27 ліпеня адзначалі ў 1992-м**, праз год пасьля абвяшчэньня самастойнасьці. Напярэдадні сьвята вандалы зьнішчылі мэмарыяльны знак у Курапатах, але ён быў адноўлены і 27 ліпеня яго асьвячаў а.**Ян Матусэвіч**. Адбыліся таксама афіцыйныя мерапрыемствы з удзелам кіраўнікоў дзяржавы, шэсьце па пр.Скарыны ад плошчы Незалежнасьці да сквэру Янкі Купалы, зладжанае дэмакратычнымі партыямі. Сьвяткаваньне праходзіла пад дзяржаўнай бел-чырвона-белай сымболікай, але менскія вуліцы чамусьці былі ўпрыгожаныя чырвонымі сьцягамі.

27 ліпеня **1993** году ў менскай штаб-кватэры БНФ адбылася сустрэча кіраўнікоў Фронту з журналістамі, прымеркаваная да Дня Незалежнасьці. **Зянон Пазьняк** гаварыў, што, «калі б не Народны Фронт, ніякай незалежнасьці, ніякай Дэклярацыі аб сувэрэнітэце і ніякага сьвята не было б». Паводле яговых словаў, пасьля зьмены ўлады ў краіне Дзень Незалежнасьці будзе сьвяткавацца 25 сакавіка, але і пра 27 ліпеня не забудуцца, бо гэтая дата таксама ўвайшла ў гісторыю.

У **1994** годзе ў Дзень Незалежнасьці БНФ зладзіў невялікае шэсьце ад плошчы Незалежнасьці да сквэру Янкі Купалы, дзе адбыўся мітынг. Прэзыдэнт А.Лукашэнка разам зь сьпікерам парлямэнту М.Грыбам ускладаў вянок да манумэнту Перамогі. Увечары 27 ліпеня некалькі соцень прадстаўнікоў розных нацыяналістычных арганізацый і партый зладзілі шэсьце з паходнямі па праспэкце Скарыны. Яны прайшлі калёнай ад плошчы Незалежнасьці да плошчы Перамогі.

Разважаючы пра даты, якія прэтэндуюць на статус сьвята Незалежнасьці, журналіст «Звязды» **Валянцін Жданко** пісаў: «Зрэшты, час усё расставіць па сваіх месцах — нашчадкі з вышыні гадоў разьбяруцца, якія дні ўшаноўваць і якім асобам аддаваць даніну павагі».

У ліпені **1995**-га, з нагоды чарговае гадавіны Незалежнасьці, газэта «Свабода» апытвала палітыкаў і грамадзкіх дзеячоў. **Васіль Быкаў**, адказваючы на пытаньне «Ці задавальняе Вас тое, як праходзіць сьвяткаваньне Дня Незалежнасьці?», адказаў: «Ня толькі незадаволены! Гэта было б нават сьмешна, калі б не было гэтак сумна. Такое «сьвяткаваньне» магчымае толькі ў краіне з таталітарным рэжымам». **Генадзь Карпенка** падкрэсьліў, што «фактычна Дзень Незалежнасьці ня стаў нацыянальным сьвятам, і гэта сумна. Сумная гэтая дэманстратыўная абыякавасьць».

У ліпені **1996** г. з зваротам да беларускага народу выступіў Нацыянальны аргкамітэт сьвяткаваньня Дня Незалежнасьці Рэспублікі Беларусі. «Няма ў сучаснай гісторыі Беларусі больш значнай і лёсавызначальнай падзеі. Спраўдзіліся мары многіх пакаленьняў нашых продкаў аб стварэньні самастойнай беларускай дзяржавы... Таму мы ўпэўненыя, што зь цягам часу 27 ліпеня стане нашым найвялікшым сьвятам», — гаворыцца ў дакумэнце, пад якім паставілі подпісы В.Быкаў, С.Багданкевіч, З.Пазьняк, С. Шушкевіч ды інш. Напярэдадні сьвяткаваньня з скандальнай заявай выступіў старшыня камітэту па нацыянальнай бясьпецы Дзярждумы Расеі Віктар Ілюхін, які агучыў «плян змовы ЦРУ супраць Беларусі». Сярод іншага ў плянах «змоўшчыкаў» нібыта была арганізацыя шматтысячнага апазыцыйнага шэсьця. Нягледзячы на гэтую правакацыю, 27 ліпеня ў Менску прайшло самае масавае сьвяткаваньне Дня Незалежнасьці за ўсю яго гісторыю. У шэсьці і мітынгу ўзялі ўдзел ад 20 да 30 тысячаў чалавек.

Праз год, у **1997-м**, такое самае шэсьце і мітынг у Менску сабралі ўсяго пяць тысячаў чалавек. Яшчэ да пачатку сьвяточных мерапрыемстваў міліцыянты зрабіліператрус у офісе БНФ. Шукалі халодную зброю, але не знайшлі, задаволіліся канфіскацыяй чатырох транспарантаў і некалькіх дрэўкаў да сьцягоў. У Опэрным тэатры нечакана была адключаная электрычнасьць, у выніку чаго мітынг на плошчы Парыскай камуны праводзіўся пры мэгафоне, а рок-канцэрт быў адменены. Легендарны **Мірон** у ноч з 25 на 26 ліпеня вывесіў бел-чырвона-белы сьцяг на 40-мэтровай мачце электралініі напругай у 110 тыс. вольт.

Працяг на старонцы 12.

Віталь Сіліцкі

# Рэспубліка «Клачок зямлі»

Інтэрвію беларускага прэзыдэнта, тройчы паказанае 30 чэрвеня па ўсіх нашых тэлеканалах, стала падзеяй, можна сказаць, доўгачаканай. Многім хацелася пачуць адказ на пытаньне, якое вельмі слушна задаў у самым пачатку гутаркі адзін з інтэрвіюэраў. Маўляў, столькі гадоў культывавалі настальгію па савецкіх часах, а тут пачалі казаць пра незалежнасьць; дык што ж гэта такое для нас — незалежнасьць?

Трэба сказаць, адказу на гэтае пытаньне беларускае грамадзтва чакае ўжо даўно, як мінімум з таго часу, калі ў расейска-беларускіх адносінах намеціўся крызыс і казка пра рай нябесны, які вось-вось павінен настаць пасьля таго, як мы зьліёмся ў экстазе з усходняй суседкай, пачала выпетрывацца з галоваў наіўных выбарнікаў.

Спадар прэзыдэнт, хто мы, куды ідзём і навошта нам трэба незалежнасьць, самастойнасьць, дзяржаўнасьць? На такое пытаньне, як ні дзіўна, адказ ва ўсе часы можа быць адным: незалежнасьць — гэта выражэньне памкненьня народу, які ўсьвядоміў сябе нацыяй, да волі, да ўласнага шчасьця, да права быць гаспадаром на сваёй зямлі. І Лукашэнка быццам бы злавіў гэту ноту. «Незалежнасьць для мяне — гэта тое самае, што і для вас».

Добры пачатак, але толькі вось чым зьяўляецца незалежнасьць «для нас», прэзыдэнт па-ранейшаму мяркуе вызначаць сам. Як выявілася, найперш гэта незалежнасьць ад прыватніка. Яна рэалізуецца ў праве выехаць у лес на шашлыкі, не баючыся пераступіць межы чыіхсьці пэрсанальных уладаньняў. Англія, трэба разумець, ужо палову тысячагодзьдзя знаходзіцца ў каляніяльным валоданьні. Дарэчы, пры ўсёй павазе да поглядаў Аляксандра Лукашэнкі варта адзначыць, што называць уласную краіну «кавалкам», ці «клачком» зямлі — неяк ня вельмі ўзвышана, тым больш для кіраўніка дзяржавы…

Далей прэзыдэнт расхвальвае незалежнасьць ад прыватнага капіталу. Ізноў агучаны перавагі «беларускай эканамічнай мадэлі» і расьпісаны ўсе жахі прыватызацыі і «абвальнай лібэралізацыі».

Па-трэцяе — незалежнасьць ад цывілізаваных форм палітычнага ладу. Лукашэнка нарэшце расшыфраваў свой тэзыс пра «маральнае лідэрства» Беларусі ва ўсходнеэўрапейскай цывілізацыі. Аказваецца, мы зьяўляемся лідэрамі таму, што захоўваем традыцыі народнага веча (якое цяпер, трэба разумець, увасабляецца ў форме ўсебеларускіх зьездаў, рэфэрэндумаў і сэмінараў).

Ну і, нарэшце, па-чацьвертае — незалежнасьць ад саміх сябе, уласнай нацыянальнай культуры і гісторыі. Аляксандар Лукашэнка па-ранейшаму лічыць беларусаў ня нацыяй, а часткай нейкага ўсходнеславянскага «этнасу». Адразу патлумачу: я шчыра люблю нашых усходнеславянскіх братоў, іх вялікія мовы, культуры, літаратуру… Але вось толькі Беларусь і беларускае для мяне — сваё, роднае, і самае галоўнае — асаблівае, непаўторнае. Менавіта на ўсьведамленьні такой непаўторнасьці і будуецца нацыянальная самасьвядомасьць, без якой размовы пра незалежнасьць зводзяцца да местачковага прымітывізму. Зь іншага боку, менавіта на ўсьведамленьні асаблівасьці і непаўторнасьці суседзяў узьнікае павага да іх культур, да іх ідэнтычнасьці.



IREX-PROMEDIA

Такім чынам, можна казаць пра тры тэндэнцыі, якія выявіліся ў праграмным інтэрвію Лукашэнкі.

Па-першае, асновай ідэалёгіі дзяржаўнай незалежнасьці па-ранейшаму бачыцца паўпатрыятызм часоў БССР («паў-» — таму што ён быў яшчэ і наднацыянальным, савецкім). Такі спэцыфічны патрыятызм нібыта і прызнае беларусаў як нацыю, а нібыта і не прызнае, нібыта і дае ім права на дзяржаву, а нібыта і не. Быў бы Савецкі Саюз, усё было б зразумела, але ў цяперашніх рэаліях сэнтэнцыі прэзыдэнта здольныя толькі яшчэ больш заблытаць беларускае грамадзтва, колькі ні малюй ілюзію савецкага мінулага на «клачку зямлі», які трапіў пад кіраваньне Лукашэнкі. Што рабіць, прыкладам, з Расеяй, якая пэўна не прызнае нас за БССР, а сябе за РСФСР? Не дае адказу на гэтае пытаньне афіцыйная ідэалёгія. Зразумела, што ў Расею не жадаюць, а без Расеі нельга. Ствараецца ўражаньне, што афіцыйны Менск чакае другога прышэсьця Ельцына зь яго інтэграцыйнымі тостамі.

Па-другое, у аснову нацыянальнай самаідэнтыфікацыі беларусаў прэзыдэнт увесь час спрабуе пакласьці палітычныя характарыстыкі, якія найбольш выразна адлюстроўваюць яго сыстэму кіраваньня. Хісткія асновы, адзначым сабе, якія могуць справакаваць яшчэ адзін крызыс самаідэнтыфікацыі ў будучыні. Палякі, напрыклад, былі палякамі і пры цару, і пры Пілсудзкім, і пры камунізьме, і пры лібэралізьме. А мы — кім будзем мы, калі савецкія ідэалягічныя догмы канчаткова зьнікнуць у мінулым?

Ну і, нарэшце, па-трэцяе — для легітымізацыі свайго палітычнага і ідэалягічнага курсу Лукашэнка карыстаецца выключна страшылкамі дзесяцігадовай даўніны. Напрыклад, аказваецца, на пачатку дзевяностых, калі ў Беларусі нібыта кіравалі нацыяналісты, расейскія людзі сядзелі на чамаданах. Хто-небудзь бачыў хоць бы адну такую гаротную групу? Потым, паводле Лукашэнкі, Расея ператварылася ў сыравінны прыдатак Захаду. Беларусу ж дастаткова зайсьці ў любую — ці харчовую, ці прамтаварную — краму, каб задацца пытаньнем, а ў які прыдатак Расеі ператварыліся мы самі, калі прылаўкі завалены таварамі адтуль…

Карацей кажучы, незалежнасьць для Лукашэнкі — гэта толькі незалежнасьць яго палітычнага рэжыму, па-за рамкамі якога «клачка зямлі», больш шырока вядомага як Беларусь, Лукашэнка нават не ўяўляе. Ад старых часоў настальгіі па СССР і «славянскай інтэграцыі» засталася ў спадчыну таксама ідэалёгія — яе проста перайменавалі ў ідэалёгію незалежнай дзяржавы, але гэта яшчэ не азначае, што яна стала такой.

Нават рэзкае зьмяненьне абліччa ворага нікога не павінна ўводзіць у зман. Прыгадаем, што і тады, калі галоўным ворагам быў «злосны монстар NATO, які падпаўзае да сінявокай Беларусі» (а не, як цяпер, расейскія алігархі, «якія ўжо страляюць у нашы прадпрыемствы сваімі зеграмі»), наш прэзыдэнт «з жулікамі, уключаючы Расею», акцыянавацца таксама не зьбіраўся. Але вось бяда: Лукашэнка гатовы стаяць на шляху тых, хто зьбіраецца нас «пакласьці, разьдзяліць і расчляніць», аднак ня можа даць зразумелага адказу, чаму мы павінны гэтаму супраціўляцца. Бо адказ «таму што мы народ, мы нацыя» сваім гордым гучаньнем, сваёй сілай сам па сабе пагражае незалежнасьці рэжыму Лукашэнкі.

**«Беларускія навіны»**

# Нэазалежнасьць

Ліпень — самы «незалежніцкі» месяц у беларускім календары. 3-га дзень вызваленьня Менску ад фашыстаў сьвяткуе рэжым; 15-га адзначаецца гадавіна Грунвальду; 27-га надыходзіць дзень прыняцьця «Дэклярацыі незалежнасьці» 1990 г. І паколькі цяпер «незалежнасьць» зрабілася агульным месцам прамоваў Лукашэнкі й дэвізам прапаганды трох дзяржаўных каналаў — самы час разабрацца з панятkамі.

Тое, што сёньняшні рэжым называе «незалежнасьцю», насамрэч — *нэазалежнасьць*. Пасьля некалькіх гадоў адлігі пачатку 90-х Беларусь стала зноў залежнай — ад расейскае імпэрскасьці, саўковых мітаў і саўгаснае дыктатуры. І абсалютна натуральна, што галоўным сьвятам эпохі нэазалежнасьці стала 3 ліпеня — дзень, калі нацысцкая акупацыя зьмянілася аднаўленай бальшавіцкай.

Нэазалежнасьць — гібрыд колішняе акупацыі з уласнай уладнай нішчымнасьцю.

Нэазалежнасьць — гэта калі Беларусь абвяшчаецца духовым лідэрам Усходняе Эўропы (што, насамрэч, не пазбаўлена гістарычных падставаў), але пад «духоўнасьцю» маецца на ўвазе выключна расейскае праваслаўе.

Нэазалежнасьць — гэта калі маскоўскія каналы перакрываюцца сваімі, але свае выходзяць на правінцыйным узроўні й зноў жа па-расейску.

Нэазалежнасьць — гэта калі ад FM-станцыяў патрабуецца 50% беларускага этэру, але пад «беларускім» разумеюць Барыса Маісеева ды Саладуху — і станцыі, праклінаючы дзяржаву, круцяць усю гэтую лухту ўначы.

Нэазалежнасьць — гэта калі ўлада трубіць пра «найлепшую беларускую адукацыю» і адначасова зьнішчае адзіную нацыянальную навучальную ўстанову.

Нэазалежнасьць — гэта паўсюдныя помнікі Пушкіну й вуліцы Маякоўскага ды адсутнасьць улады на пахаваньні Быкава.

Неўвядзеньне безнаяўнага расейскага рубля, адмена продажу «Белтрансгазу» ды прадпрыемстваў нафтахіміі, падрыхтоўка «ўласнага варыянту» Канстытуцыйнага акту — заканамерныя крокі палітыкі нэазалежнасьці. Бо ўсё гэта — толькі падбор краплёных козыраў перад жнівеньскай сустрэчай з Пуціным. У гадавіну мухаў, катлетаў і расейскага ўльтыматуму рэжым можа пасьпяхова правесьці гандаль з Крамлём — і тады непазьбежны рэфэрэндум з новымі спазмамі інтэграцыі й трэцім тэрмінам Лукашэнкі. Або, калі гульня будзе няўдалай, уладзе застанецца замыкацца ў сабе й міжволі беларусізавацца.

Нэазалежнасьць — проста чырвона-зялёная бутафорыя, якая ёсьць усяго толькі пераходнай формай. У беларускай нацыянальнай эліты аб'ектыўна хапае сілаў, каб зьмяніць чужое «нэа» на беларускае «не!». 15-тысячнае шэсьце пад бел-чырвона-белымі сьцягамі на пахаваньні Быкава, абарона ліцэю й перамога над катэджамі ў Курапатах — гэта ўжо эфэкты «НЕ—ЗАЛЕЖНАСЬЦІ!». Але дзеля таго, каб нэазалежнасьць скончылася Беларусяй, аднаго адмаўленьня мала. Патрэбная сыстэмная альтэрнатыва ўсім відам залежнасьцяў: цэласная нацыянальная ідэя, ясная мадэль дзяржавы й едны беларускі рух.

**Павал Севярынец**

# Адзінаццаць абліччаў незалежнасьці

**Працяг са старонкі 11.**

З 1997-га Дзень Незалежнасьці 27 ліпеня перасталі адзначаць улады — гэта было наступства рэфэрэндуму 1996 г., у адпаведнасьці з якім сьвята перанесьлі на 3 ліпеня (дзень вызваленьня Менску ад нямецкіх акупантаў у 1944 г.).

27 ліпеня **1998**-га дэмакратычныя партыі ладзілі шэсьце ад кінатэатру «Кастрычнік» да Опэрнага. На праспэкце Скарыны адбылася сутычка дэманстрантаў з групай скінхедаў, якіх пасьля затрымала міліцыя. У **1999** г. акцыю ў Дзень Незалежнасьці наладзіла Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная грамада). Пасьля яе лідэра Міколу Статкевіча арыштавалі і судзілі за арганізацыю сутыкненьняў паміж дэманстрантамі і міліцыянтамі падчас Маршу свабоды і Дня Незалежнасьці.

У **2000** г. сьвяткаваньне Дня Незалежнасьці праходзіла ў менскім парку Дружбы народаў у форме канцэрту. У гэты ж дзень Вярхоўны Савет XIII скліканьня правёў «круглы стол» на тэму «Дзесяць гадоў незалежнасьці: перамогі і паразы».

Самую гучную акцыю на Дзень Незалежнасьці ў **2001** г. зладзіў незарэгістраваны рух «Зубр». Некалькі сотняў «зуброў» сабраліся на плошчы Перамогі і ўсклалі да манумэнта бел-чырвона-белы вянок і кветкі. Тут адбыўся і прыём у шэрагі «Зубра» новых сяброў, якія складалі прысягу на вернасьць Беларусі. Арганізаванае рухам шэсьце ў бок Кастрычніцкай плошчы было спыненае супрацоўнікамі праваахоўных органаў, а яго ўдзельнікі былі расьсеяны.

27 ліпеня **2002** г. на Кастрычніцкай плошчы сталіцы актывісты незарэгістраванага «Маладога фронту» і Беларускай асацыяцыі журналістаў арганізавалі жывы ланцуг. У руках яны трымалі бел-чырвона-белыя сьцягі і незалежныя газэты.

**Падрыхтаваў Алег Тачоны**

# Пра Лукашэнкаў нацыяналізм

**Апошні час вельмі шмат увагі надаецца абмеркаваньню новай прэзыдэнцкай палітыкі ў галіне ідэалёгіі.** Я, шчыра кажучы, новага ў ёй нічога ня бачу. Усе гэтыя ідэалягічныя гаворкі гаворацца, каб толькі штосьці сказаць, заняць прэзыдэнтам тэле- і радыёэтэр, зрабіць выгляд, што абмяркоўваецца штосьці важнае, каб чулі і бачылі прэзыдэнцкае дбаньне аб народзе. Беларускім нацыянальным інтарэсам там і ня пахне, новых напрамкаў у палітыцы не назіраецца.

У прамове на сэмінары прэзыдэнт заклікае на прыклад французаў і немцаў будаваць дзяржаўную ідэалёгію на родным падмурку, але ж родны падмурак для яго — СССР. («Ідэалёгія гэтай дзяржавы — наша беларуская ідэалёгія».) Нешта я не прыпомню, хоць і лепш за прэзыдэнта вучылася, каб у савецкай школе нас вучылі чаму-небудзь беларускаму. Нас не вучылі любіць Беларусь, сваю мову, культуру, рэспубліку, урэшце. Нам казалі, што мы мусім любіць «нашу вялікую Родзіну — СССР», а вучылі любіць толькі адну Расею. Калі хто з маіх аднагодкаў ня згодзен, дык, можа, здольны назваць, што ён праходзіў у савецкай школе з узбэцкай, казахскай, туркмэнскай, літоўскай і іншых літаратур ці, можа, хоць чуў што пра іх кампазытараў, навукоўцаў, вынаходнікаў. Затое расейскіх клясыкаў, што праходзілі ў школе, нам старонкі ня хопіць пералічыць, і пішам мы ўсе без памылак лепш за расейцаў. І дагэтуль з школьнай праграмы памятаем, што паравую машыну вынайшаў расеец Паўзуноў, а ня нейкі там Джэймз Уайт.

Успомнілі? Зыходзячы з савецкіх школьных праграмаў, савецкі патрыятызм — гэта расейскі патрыятызм. Савецкая ідэалёгія — гэта расейская ідэалёгія. Ну і ў чым жа тут СМІ і палітолягі ўбачылі нацыяналізм Лукашэнкі? Нацыяналізм якой нацыі?

Мне зноў шкада дзетак і школьных настаўнікаў. У большасьці ад такой блытаніны можа быць проста кароткае замыканьне. Але калі настаўнік адукаваны, дасьведчаны, ён разьбярэцца і сам вырашыць, чым ня варта засьмечваць дзіцячыя галоўкі і за якую Краіну трэба выхоўваць гонар і адказнасьць у малых грамадзянаў. Сумленнаму настаўніку межы праграмы не перашкода.

Між іншым, старым настаўнікам, больш чым каму-небудзь, нельга скардзіцца на жыцьцё. Краінай кіруюць іх вучні — гадаванцы савецкай школы, носьбіты савецкай ідэалёгіі.

А сёньняшнім настаўнікам і бацькам трэба памятаць прымаўку: «Што пасееш, тое і пажнеш». Мы ўсе і бацькі, і ў нечым настаўнікі. І для сябе ж сеем, не для Лукашэнкі. Вось і ўся ідэалёгія.

**Таісія Мішчанка, Масква**

# Выдавайце дэтэктывы!

**Апошнім часам на паліцах кнігарняў зьявілася шмат розных анталёгіяў: маладога вершу, беларускай эпіграмы і інш.** Гэтыя вышэйзгаданыя кнігі безумоўна патрэбны і, не сумняюся, знойдуць свайго чытача. Але ня трэба забываць і пра такі папулярны жанр, як дэтэктыў.

Чаму б нашым вельмі шаноўным спадарам выдаўцам ня выдаць анталёгію беларускага дэтэктыву, у якую б увайшло ўсё самае лепшае, што было напісана, — ад «Лябірынтаў» В.Ластоўскага да А.Глёбуса і твораў іншых выбітных пісьменьнікаў Беларусі.

**Літвусь Крывейта, Менск**

# Гомельскі гіт-парад

**(І паўгодзьдзе 2003 г., на падставе продажаў у прыватнага распаўсюдніка)**

**Кнігі:**

1. Андрэй Котлярчук «Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў».
2. Васіль Быкаў «Доўгая дарога дадому».
3. Генадзь Сагановіч «Нарыс гісторыі Беларусі».

**CD:**

1. NRM «Dom kultury».
2. Тройца «Журавы».
3. «Крамбамбуля. Паўлітра добрага настрою».

**Аўдыё:**

1. Віктар Шалкевіч «Добрай раніцы».
2. Стары Ольса «Вір».
3. NRM «Пашпарт NRM».

**Відэа:**

1. «Пан Тадэвуш».
2. «Шрэк» (мультфільм).
3. «Адважнае сэрца».

**Андрэй Бандарэнка, Гомель**

# Дзень Незалежнасьці

**Набліжаецца 27 ліпеня.** У гэты сьвяточны і гістарычны дзень хочацца выйсьці на плошчу Незалежнасьці (дарэчы, у Вялейцы такой плошчы няма, затое ёсьць Леніна) пад бел-чырвона-белым сьцягам. На жаль, ніхто ня будзе ладзіць буйных урачыстых дэманстрацыяў, гучных выступаў зь сьвяточнае нагоды. Шкада, бо менавіта ў такія дні грамадзтва павінна кансалідавацца. Гісторыя для ўсіх адна. Нехта скажа, што ў Савецкім Саюзе добра жылося, але як можна жыць у дзяржаве, дзе адзін прыціскае астатніх.

**Алесь зь Вялейкі**

# Паважаны спадару міністар!

**Зь бясконцым хваляваньнем сачу за разьвіцьцём падзеяў вакол Гуманітарнага ліцэю.** Змаганьне ліцэістаў, іх бацькоў і выкладчыкаў за свой ліцэй выклікае шчырую павагу і гонар за іх. Ды толькі сорамна невыносна, горка і балюча назіраць, як бяздушная дзяржаўная машына спрабуе іх раздушыць.

Спадару міністар! Заклікаю Вас: не губіце Ліцэй, які ўжо колькі гадоў ёсьць хаткаю роднаю беларускаю для дзетак і іх добрых настаўнікаў! Не разбурайце калыскі беларускасьці! Супыніце барбарскія захады супраць ліцэю! Не рабецеся барбарам!

**Эрына Цурпанава, настаўніца расейскае літаратуры і мовы, Магілёў**

• А С Я Р О Д З Ь Д З Е •

# Мой Ленін

**Ленін жыў, Ленін жыве, Ленін будзе жыць…** У зусім недалёкія яшчэ гады свайго ружовага дзяцінства ты ўпершыню сустрэў гэтыя словы ў старой савецкай кніжцы. Зь яе старонак на цябе пазіраў, прымружыўшы вочы і хітравата пасьміхаючыся, немалады лысаваты чалавек, якога аўтары пяшчотна называлі «наш добры дзядуля Ленін». На той час ужо завяршылася перабудова, Савецкі Саюз быў ахоплены перадсьмяротнай агоніяй, абвяргаючы старыя ідэалы, і ранейшыя правадыры ўжо не карысталіся былой любоўю і павагай. Таму дарослыя патлумачылі табе, што «дзядуля Ленін» не зусім «наш» і, тым болей, зусім ня «добры». Крыху пазьней гэтыя словы і твая ўпэўненасьць у тым, што ён «нехарошы дзядзька», спрычыніліся да тваёй дыскусіі з бабуляй, у выніку чаго ты быў пасаромлены ейнымі беззакорнымі, як табе здавалася тады, доказамі. Канчаткова зьбіты з тропу, ты перастаў дапытвацца ў дарослых, кіруючыся прынцыпам «вырасьцеш — зразумееш». Пазьней, у дзявятай клясе, ты даведаешся, што Ленін быў апантаным рэвалюцыянэрам і кіраўніком бальшавіцкае партыі. А яшчэ пазьней, прачытаўшы сёе-тое зь ягоных твораў, з зьдзіўленьнем адкрыеш, што знакамітая сэнтэнцыя «вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца» была адрасаваная будаўнікам камуністычнага грамадзтва, а ня тым малалетнім бэйбусам, якіх настаўнікі, абапіраючыся на непахісны аўтарытэт правадыра, прымушалі ўзяцца за розум.

Мінула больш за дзесяць гадоў, як канула ў нябыт савецкая імпэрыя. Аднак дагэтуль амаль у кожным беларускім горадзе ці мястэчку ёсьць свой Ленін. І часьцяком нават не адзін. У тваім родным Мазыры выявы Ільліча даўно ўжо сталі неад'емнаю часткай гарадзкога пэйзажу. Помніцца, на двары той школы, дзе ты пачынаў свой шлях да ведаў, стаяў на высокім пастамэнце велічны бюст Леніна, які падчас гульняў у сьнежкі служыў выдатнай мішэньню. Дый сам ты, беручы актыўны ўдзел у сьнежных баталіях, нярэдка паддаваўся спакусе пусьціць пару «снарадаў» у задуменнае аблічча правадыра. А знаёмы хлопец з Полацку распавядаў, як тамтэйшая моладзь робіць на галаве ў свайго Леніна панкаўскі «іракез» з сьнегу. Хоць гэта хутчэй вынятак з правілаў. Звычай на лысай галаве фігуруе простая кепка.

Ленін бывае зробленым ў поўны рост ці абрэзаным па плечы; ён можа або сядзець у глыбокім одуме, або стоячы маячыць на цэнтральным гарадзкім пляцы, які, безумоўна, носіць ягонае імя. Постаць, што ўпрыгожвае цэнтар твайго гораду, заслугоўвае ўвагі: правадыр стаіць, выцягнуўшы наперад правую руку, паказваючы шлях у сьветлае мінулае. Праходзячы паблізу, чамусьці пачынаеш верыць у бесьсьмяротнасьць чалавечае душы. Аднойчы памершы, Уладзімер Ульянаў увасобіўся ў мностве іпастасяў. «Ленин всегда с тобой…». Мы ходзім па вуліцах, названых ягоным імем, ямо хлеб і садавіну, вырашчаную ў калгасах «Шлях Ільліча» і «Ленінская іскра», прызначаем спатканьні ля ягонага помніка, на пастамэнце якога падчас народных гуляняў ладзіцца імправізаваны банкет з гарэлкай і закусонам. Здаралася, што аматары экстрыму, натхнёныя колькасьцю выпітага, залазілі на помнік і ставілі на выцягнутую руку статуі пустую бутэльку. Такім чынам, няпэўны жэст правадыра набываў актуальнасьць і лягічную завершанасьць. Адрозна ад моладзі, што не адчувае асаблівай павагі да савецкай спадчыны, пэнсіянэры ставяцца да свайго куміра з глыбокай пашанай і любоўю. Прыходзіць на памяць ясная лістападаўская раніца, пляц у чырвоным полымі сьцягоў і духавы аркестар, які з імпэтам выдае папуры рэвалюцыйных мэлёдыяў. На нейкую хвілю ты адчуў, што перанёсься дзесьці на чвэрць стагодзьдзя ў мінулае. Ад гэтае думкі становіцца ніякавата, але, тым ня менш, ты зь цікавасьцю назіраеш за ходам падзеяў. Табе чамусьці робіцца шкада гэтых бедна апранутых людзей у гадох з стомленымі ад доўгае працы тварамі. Але ім не патрэбная твая шкадоба. Бо яны вераць. Вераць у таго бога, якога самі стварылі. З году ў год яны ўскладаюць да п'едэсталу кветкі… Апошняе ўшанаваньне старых ідалаў…

«Ленін жыў…»

Нейкая незразумелая туга падступае да сэрца. Ты хуткім крокам праходзіш вуліцу Савецкую, мінаеш Ленінскую, паднімаешся на Гару Камунараў, адкаркоўваеш набытую па дарозе пляшку піва і, робячы глыток за глытком, з вышыні птушынага палёту ў маркоце сузіраеш горад, ахоплены барвовым зьзяньнем.

«Ленін жыў…»

**Рыгор Алейнікаў, Мазыр**

# Кнігі поштай



Н О В А Е

| | |
|---|---|
| **НАША НІВА. 1911 г. Выпуск 4. Факсымільнае выданьне.** 684 с. | 10000 |
| **СПАДЧЫНА 2002. №4.** 96 с. | 4500 |
| **ТАРАСАЎ Кастусь. Беларусь. Гістарычнае падарожжа для дзяцей.** 112 с., цьвёрдая вокладка. | 8400 |
| **ЦІХАНАВА Ганна. Фільтры сноў.** 126 с. | 3500 |
| **ЛАГОДНЫ ЦМОК.** Зборнік ангельскіх літаратурных казак. 120 с. | 1000 |
| **ДЗЕЯСЛОЎ 2003. №3.** 256 с. | 4000 |
| **СУІНДЖВУД Элан. Сьціслая гісторыя сацыялягічнай думкі.** 349 с. | 1800 |
| **УРБАН Паўла. Старажытныя ліцьвіны. Мова, паходжаньне, этнічная прыналежнасьць.** 261 с. | 4400 |
| **ВАЛЬЕХА Сэсар. Чорныя геральды.** Выбраная лірыка. 143 с. | 1900 |
| **БАРАДУЛІН Рыгор. Лісты ў Хельсынкі.** 84 с. | 1000 |
| **ЗАПІСЫ БЕЛАРУСКАГА ІНСТЫТУТУ НАВУКІ І МАСТАЦТВА №26. New York — Miensk 2003.** 224 с. | 3100 |
| **СТУЖЫНСКАЯ Ніна. Беларусь Мяцежная. З гісторыі антысавецкага ўзброенага супраціву. 20-я гады XX стагодзьдзя.** 256 с. | 20000 |
| **АРЛОЎ Уладзімер. Ордэн Белай Мышы: Аповесьці, апавяданьні.** 301 с. | 3800 |
| **ARCHE-Пачатак 2003. №2**. 200 с. Тэма нумару — «Туманнасьці беларускай гісторыі». | 2000 |
| **MARA Алесь. Аўтаманаграфія.** 168 с. | 25000 |
| **АРЛОЎ Уладзімер, ГЕРАСІМОВІЧ Зьміцер. Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя.** 320 с., цьвёрдая вокладка. | 40000 |
| **КРАЎЦЭВІЧ Аляксандар. Стварэньне Вялікага Княства Літоўскага.** 240 с. | 4200 |
| ВІДЭА: **ГЛЯДЫЯТАР.** Гістарычная драма, 154 хв. | 4900 |

* * *

| | |
|---|---|
| **150 ПЫТАНЬНЯЎ І АДКАЗАЎ З ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ.** 238 с., цьвёрдая вокладка, укл. і прадм. — Зьм. Санько, І. Саверчанка. | 10000 |
| **ARCHE-Пачатак 2002**. №1. 184 с. | 1500 |
| **ARCHE-Пачатак 2002**. №2. 256 с. Тэма нумару — «Нашы дзеткі». | 1900 |
| **ARCHE-Пачатак 2002**. №3. 296 с. Тэма нумару — «Андрэй Хадановіч» | 2000 |
| **ARCHE-Пачатак 2003**. №1. 208 с. Тэма нумару — «Расейскае пытаньне». | 2000 |
| **CASTRUM, URBIS ET BELLUM.** Зборнік навуковых прац. 422 с. | 6000 |
| Vostraja Brama 0: **ГЛЁБУС Адам.** Post Scriptum. 176 с. | 3000 |
| Vostraja Brama 3: **ЛУКАШУК Аляксандар.** У фіялетавай ночы вугал крыла. 160 с. | 3000 |
| Vostraja Brama 4: **БАРТОСІК Зьміцер. Чорны пісталет.** Апавяданьні з уласнага жыцьця. 240 с. | 6000 |
| Vostraja Brama 5: **Глёбус Адам «Браслаўская стыгмата».** 192 с. | 3000 |
| **АРЛОЎ Уладзімер, САГАНОВІЧ Генадзь. Дзесяць вякоў беларускай гісторыі.** 223 с., цьвёрдая вокладка. | 7000 |
| **АДАМОВІЧ Алесь. VIXI.** 502 с. Тры апошнія аповесьці. | 12600 |
| **АДАМОВІЧ Славамір. Турэмны дзёньнік.** Дакумэнты, дзёньнікі, вершы. 160 с., цьвёрдая вокладка. | 3800 |
| **АДАМЧЫК Вячаслаў. Нязрушаны камень.** 320 с. | 3000 |
| **АСТРАВЕЦ Сяргей. Цэнзарскія нажніцы.** 546 с. | 5600 |
| **АСТРАЎЦОЎ Сяргей. Лісты да гома саветыкуса.** 300 с. | 4200 |
| **БАРЫСЕВІЧ Юрась. Alter Nemo.** 136 с. | 3500 |
| **БАБКОЎ Ігар. Адам Клакоцкі і ягоныя цені.** 110 с. | 4200 |
| **БАБКОЎ Ігар. Герой вайны за празрыстасьць.** 92 с. | 2100 |
| **БАШУРА Міхась. Паліваньне на мух са шланга.** 64 с. | 1000 |
| **Беларуска-расійская інтэграцыя. Аналітычныя артыкулы.** 424 с. Рэдактура Валера Булгакава. | 3000 |
| **Беларуская палітычная сыстэма і прэзыдэнцкія выбары 2001 г.** 480 с. English version — 5000 руб. | 3000 |
| **Беларускі гістарычны агляд. Том 8.** Сшытак 1-2 (14-15). 384 с. | 3500 |
| Беларускі кнігазбор т.15: **Мікалай УЛАШЧЫК. Выбранае.** 608 с. | 3800 |
| Беларускі кнігазбор т.18: **ЦЁТКА. Выбраныя творы.** 336 с. | 3500 |
| Беларускі кнігазбор т.19: **Н. АРСЕНЬНЕВА. Выбраныя творы.** 592 с. | 4700 |
| Беларускі кнігазбор т.20: **Янка КУПАЛА. Выбраныя творы.** 640 с. | 3900 |
| Беларускі кнігазбор т.21: **Ігнат ДАМЕЙКА. Мае падарожжы.** 496 с. | 4800 |
| Беларускі кнігазбор т.22: **Гаўрыла ГАРЭЦКІ. Выбранае.** 544 с. | 6000 |
| **Беларускі малітаўнік.** 784 с. Укладзены а. А.Надсанам. | 6000 |
| **Беларускія маршы і песьні.** 62 с. | 2000 |
| **БЕЛАРУСЬ. Фотаальбом.** 50 с., цьвёрдая вокладка. | 19000 |
| Біб-ка БГА 10: **ЮРЭВІЧ Л. Літаратурны рух на эміграцыі.** 244 с. | 4200 |
| Біб-ка БГА 3: **БЕЛЫ Алесь. Хроніка Белай Русі.** 238 с. | 4200 |
| Біб-ка БГА 9: **ТУМАШ Вітаўт. Выбраныя працы.** 246 с. | 3500 |
| **БІБЛІЯ.** Кнігі Сьвятога Пісаньня Старога і Новага Запавету ў беларускім перакладзе Васіля Сёмухі. 1536 с., цьвёрдая вокладка. | 18000 |
| **Быць альбо ня быць сярэднеэўрапейцам. Сучаснае польскае мысьленьне.** 472 с. | 1800 |
| **ГАПЕЕВА Вольга. Рэканструкцыя неба.** 142 с. | 3500 |
| **ГЕЛАГАЕЎ Алесь. Беларускія нацыянальныя вайсковыя фармацыі ў часе Другое сусьветнае вайны.** 72 с. | 2000 |
| **ДРАЗДОВІЧ Язэп. Альбом-манаграфія.** 180 с., цьвёрдая вокл. | 25000 |
| **ДАМІНІКА 2002. №1.** 28 с. Беларускі часопіс для маладых сем'яў. | 1200 |
| **ДАМІНІКА 2003. №2.** 48 с. Беларускі часопіс для маладых сем'яў. | 4900 |
| **ДЗЕЯСЛОЎ 2003. №2.** 256 с. | 4000 |
| **ДУБАВЕЦ Сяргей. Дзёньнік прыватнага чалавека.** 80 с. | 1500 |
| **Зямля N. 2002. №1**. 80 с. | 4200 |
| **ЗЯНОН. Глёрыя Патрыя.** 350 с., цьвёрдая вокладка. | 24000 |
| **КАВАЛЬ Ян. Генэрал вызвольнага фронту.** 40 с. | 2000 |
| **КАПА Натальля. Бэзавыя дрэвы.** 90 с. | 2000 |
| **КАТКОВІЧ А., КАТКОВІЧ-КЛЕНТАК В. Успаміны.** 142 с. | 5000 |
| **КІСЬЛІЦЫНА Ганна. BLONDE ATTAK.** 144 с. | 3500 |
| **КОТЛЯРЧУК Андрэй. Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў.** 296 с. | 2500 |
| **КУФЭРАК ВІЛЕНШЧЫНЫ 2001. №2 (4).** 195 с. | 3500 |
| **КУФЭРАК ВІЛЕНШЧЫНЫ 2001. №3 (5).** 188 с. | 3500 |
| **МАРАКОЎ Леанід. 100 мініяцюр.** 236 с. | 5900 |
| **МІЛАШ Чэслаў. Скуты розум.** 246 с. | 4200 |
| **МІНСКЕВІЧ Серж. Мінскія/Менскія санэты.** 60 с. | 2800 |
| **НАЦЫЯНАЛІЗМ У СЬВЕЦЕ (частка другая).** 54 с. | 1400 |
| **НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПАКЛІКАНЬНЕ.** 24 с. | 1400 |
| **НАША НІВА. 1910 г. Выпуск 3. Факсымільнае выданьне.** 800 с. | 5000 |
| **НІСБЭТ Робэрт. Кансэрватызм: мара і рэальнасьць.** 136 с. | 3000 |
| **ПАДБЯРЭСКІ Зьміцер. Саксафон Чынгісхана.** 414 с. | 3500 |
| **ПАЛІТАЛЁГІЯ. Асноўны курс.** 680 с. | 3600 |
| **ПАМІЖ №2.** 170 с. | 2800 |
| **ПЕСЬНІ КРАЮ. Сьпеўнік.** 32 с. | 2000 |
| **РАМАНЮК Міхась. Беларускія народныя крыжы.** 222 с. | 55000 |
| **СВАБОДА БЕЗЬ ЦЯБЕ.** 146 с. | 2700 |
| **СІЛЬНОВА Людка. Зеленавокія воі і іх прыгажуні.** Вершы з прысьвячэньнямі. 72 с. | 2000 |
| **СКОБЛА Міхась: Краса і сіла. Анталёгія беларускай паэзіі XX стагодзьдзя.** 880 с., цьвёрдая вокладка. | 21000 |
| **СПАДЧЫНА 2002. №2-3.** 224 с. | 2900 |
| **СТАНКЕВІЧ Ян. Беларуска-расійскі (Вялікалітоўска-расійскі) слоўнік.** 1305 с. | 22 000 |
| **СТАНКЕВІЧ ЯН. Збор твораў у 2-х тамах.** 1-шы 552 с., 2-гі 586 с. | 9000 |
| **СЬЦЯЦКО Павал. Культура мовы.** 444 с., цьвёрдая вокладка. | 4700 |
| **ТОЛКІН Дж. Р. Р. Хобіт, або Вандроўка туды і назад.** 264 с. | 5600 |
| **ФРАГМЭНТЫ №10. БАБКОЎ Ігар. Філязофія Яна Сьнядэцкага.** 136 с. | 4200 |
| **ФРАГМЭНТЫ №6 (1-2'99),** 302 с. | 4200 |
| **ФРАГМЭНТЫ №7 (3-4'99),** 288 с. | 4200 |
| **ФРАГМЭНТЫ №8 (1-2'00),** 308 с. | 4200 |
| **ФРАГМЭНТЫ №9 (3-4'00),** 304 с. | 4200 |
| **Хрысьціянскі Філязофскі Зборнік.** 168 с. | 1400 |
| **ХАРЭЎСКІ Сяргей. Зьвяры-суайчыньнікі.** 92 с. | 700 |

Атрымаць кнігі можна таксама і накладзеным плацяжом (далей — НП), г. зн. аплата — па атрыманьні на пошце. Для гэтага трэба даслаць ліст з замовай на адрас: **п/с 333, 220050, Менск** (без пазнакі «Кнігі — поштай»), пазначыўшы сваё ймя, імя па бацьку, прозьвішча і падрабязны адрас (для хуткасьці — тэлефон, e-mail, пэйджэр). Пры дасылцы НП зьніжкі ня дзейнічаюць. Цэны ў каталёгу для Менску. Для рэгіёнаў зьніжка 10% (толькі пры перадаплаце). Замову можна даслаць на e-mail **EXLIBRIS@TUT.BY** ці патэлефанаваць **(029) 643-57-33**.

Поўны каталёг з анатацыямі і вокладкамі глядзіце на сайце **http:/ exlibris.cjb.net**.

маленькае апавяданьне на невялікае сьвята

# Сьвята

Парасон чалавека ў чорным плашчы,
Нібы чорны човен, плыве ўначы.
Доўгі шлях перад тварам тваім пралёг,
І ніхто не пускае цябе на парог.
Зрэшты, хай не пускае. Патрэбна, каб ты
Паблукаў і абмокнуў сярод цемнаты,
І шыпастых зор, і шумлівых лоз,
Каб растраціў усё, што у сэрцы нёс.
Для вандроўніка ўночы галоўны максым —
Сваё сэрца заўсёды насі пустым.
Каб у момант, калі разыходзіцца мгла,
Цябе радасьць напоўніцу заліла.

*З ірляндзкага*




ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Мікола прачнуўся позна, вочы ў вочы зь ім стаяла нерухомая раніца. Дрэвы, хмары, дзіцячыя крыкі на двары застыглі, і дом застыг, ніхто ня гойсаў за сьцяною ці па лесьвіцы. «Вось яно, — падумаў Мікола, — праз тое, што я тыдзень не выходжу, навакольле адмерла за непатрэбнасьцю. Нашто круціць фільм перад гледачом, які дрыхне? Тэлефон адлучаны, усе гадзіньнікі сталі, вады ў кранах няма. Лядоўня грукоча пустымі паліцамі. Дык чаго ж я прачнуўся здаровы й вясёлы?» Мікола перабраў у памяці магчымыя прычыны радасьці. Скончаны пераклад? Не, яшчэ тыдзень трэба пасядзець. Прыйшлі грошы на картку? Не, праз два дні толькі. Так і не ўзгадаўшы, ён зірнуў на каляндар: 27 ліпеня, нядзеля. І гэтая дата нечым яго ўзрадавала. Відаць, спалучэньнем трох сямёрак — сёмы дзень тыдня, сёмы месяц, сямёрка ў лічбе... Так у роздумах Мікола і сабраўся. Пара была ехаць на летнік.

Ад Міколавага дому да вакзалу едзецца тралейбусам. Грошай не было нават на талёнчык. Трэба праехаць зайцом. Мікола сеў, унутрана рыхтуючыся да скандалу. Але кантралёры, заўсёднікі гэтай лініі, не зьявіліся. Дый сам тралейбус, пусты й ціхі, нічым не нагадваў звычайную юдоль журбы й жарсьцяў. Раніца йшла безь ніводнага падвоху, радасьць не пакідала, і Мікола падумаў, што непрыемнасьць дня будзе асабліва буйной.

Аўтобус да братавай вёскі якраз адыходзіў. Мікола прыладзіўся на першым сядзеньні з двума пачкамі семак і зборнікам вэнэцыянскай прозы. Дзьвюхгадзінная дарога абяцала адны асалоды. Мікола сёк семкі з хуткасьцю аўтамата «ўзі» і чытаў Генры Джэймза. «Сталая плыннасьць» Джэймзавага стылю супадала з мэлянхалічным калыханьнем ня надта разнастайнай прыроды за акном. У аўтобусе было вобмаль народу, і Мікола хуценька ўсіх абглядзеў. Двое мужчын, тры дзяўчыны і дама бальзакаўскага веку. Дзяўчаты глядзелі ў вокны, абыякавыя да ўсяго, апроч уласнага прыгаства. Мікола жанчын увогуле не любіў. Асабліва яму не спадабалася дама. Той не сядзелася. Вострымі вачыма яна ўзіралася ў спадарожнікаў, вышукваючы, да каго б прычапіцца. Амбітны рот аж палымнеў чырвонай шмінкай, быццам у людаеда, што пад’еў мяса зь перцам. Мікола хутчэй прыкрыўся фаліянтам. Адзін з мужчынаў, гадоў трыццаці, быў з выгляду вясковец, што выбраўся ў Менск пагуляць. Прыгожы, але зношаны цяжкай працай твар, вочы дубальтоўкай, танны пах «патройнага адэкалёну». Карацей — безграшоўе, натуральная гаспадарка, пакарабачаныя чаравікі мажа лоем… Другі, трохі падпіты 50-гадовы дзядзька, моцны, з поўным камплектам зубоў ва ўхмылцы, з тых, хто пад маскай жыцьцялюба й зубаскала хавае хцівы й хваткі розум.

Крануліся. Панылы кіроўца на ўвесь салён наракаў на прыватнікаў, якія забіраюць пасажыраў: у Менск ехала двое і назад — сем. «Вось паскарачаюць праз вас рэйсы, тады папляшаця! А часьнікі адразу цэны ўзьвіньцяць. І вазіць будуць так: хачу — павязу, а хачу — не». Пасажыры маўчалі. Не змаўчаў толькі Агнявы Рот, завёў прамову на такой трасянцы, што Мікола аж прыўзьняўся паглядзець: няўжо яе хапіла на сарказм? Не, жанчына вяшчала «на скоцкім сур’ёзе».

— Ва ўсём должан быць парадак, езьдзіць нада на аўтобусах. А аўтобусы далжны хадзіць па расьпісанію. У вас ваабшчэ парадак, Вы далжны быць давольны Вашым прэзыдэнтам…

І панеслася…

Мікола прыўзьняўся яшчэ раз: лёгкая шаўковая сукенка, залатыя акуляры, капялюшык. Добры дарожны саквояж. Хто ж гэта? Спэцагентка, пасланая правакаваць народ? А мо бухгальтарка? Бізнэсоўка? Яна гаварыла самаўпэўнена, відаць, прывыкла да пачцівай увагі. Мікола ў дыскусію не палез, хоць і сьвярбела. Ён уважаў, што культурнаму чалавеку сорамна ўступаць у дэбаты на такі банальны тэмат. Тры маладыя чубаткі таксама пагардліва маўчалі, рэючы вейкамі. Зрэагаваў толькі дзядзька: перагнуўся цераз парэнчу свайго седзіва і завёў какетаваньне.

— Правільна кажаце, дамачка, люблю дамачак, што разьбіраюцца ў палітыцы. Дазвольце руку пацалаваць? Якая культурная жэншчына, разумнейшая за мяне, хаця я й старэйшы гадоў на дзесяць.

Дама рукі цалаваць не дала, а ўлешчана сказала:

— Ашыбаецесь. Мне ўжо шэсьцьдзесят адзін, а вам жа гдзе-та пяцьдзясят?

Дзядзька зрабіў выгляд, што ўражаны. Пацалаваў-такі ручку, і прамовіў:

— Вы, наверна, работаеце на харошай рабоце? Цьвяцёце, як макаў цьвет, ня тое што мы — сельскія труженікі. Праўда, Хахол?

Малады мужчына ня даў старэйшаму сябру перавесьці размову, абурана забурчэў сабе пад нос:

— А што мне ваш Лукашэнка добрае зрабіў? За што мне яго любіць? Зарплата дваццаць тысячаў, і тае паўгоду ня плацяць, жонка кінула. Толькі на чарніла хапае…

— А Вы ня пейце! — падхапіла дама.

— Дык я і ня п’ю.

— А хазяйства сваё есьць?

— Ёсьць…

— Так што вам ешчо нада?

— А я не хачу за сала з малаком гарбаціцца зь пяці раніцы да ночы! — з выклікам сказаў Хахол.

— Вот відзіце. Как работаем, так і палучаем.

— А ў вас, відзіма, тожа сваё хазяйства? — зь ледзь заўважным зьдзекам запытаўся старэйшы.

— Зачэм мне хазяйства? Я работаю ў Сургуце, у меня там восем таргговых точак. Сібір, нефць, прыродны газ. Не нада і вам сідзець на месьце. Будзьце акціўны, мабільны, ішчыце другую работу. Да і дваццаць тысяч, маладой чалавек, у нас нікто не зарабатывает, вы што-та путаеце. Ішчыце харошую работу.

— А вот мяне на пенсію па выслузе выпіхваюць, — сказаў старэйшы. — Дзе мне тую работу іскаць?

— А са мной баяцца расстацца. Просяць: Зінаіда Трафімаўна, не брасайце нас, — павучальна сказала дама. — Работаць нужна з душой.

— Сібірачка! Вот пачаму ў вас такі цьвет ліца. Нашы жэншчыны — самыя красівыя ў міры! — зноў перавёў стрэлкі дзядзька.

Тры красуні ледзь заўважна варухнуліся. Усе памаўчалі.

— Вот, маладой чалавек, — зьвярнулася дама да Хахла, — а мама мая жывёт у дзярэўні зьдзесь. І я ей памагаю, но ей нічыво не нужна: есьць гарод, кароўка, сьвіней дзержыт, курачак…

«Мацеры гэтай чувырлы ня менш за 80—90 гадоў, а яна дагэтуль арэ як нанятая, — абурыўся Мікола. — Відаць, Хахол баіцца якраз такой пэрспэктывы». І ня вытрымаў:

— Вы жывяце ў Сургуце і нічога тут ня ведаеце. Дык і не хваліце. Тут калгасьнікі па 10—20 даляраў зарабляюць. А за што людзям зубы паставіць, дзяцей у школу адправіць, адзецца?

— Урэмя сейчас такое, а Лукашэнка тут ні пры чом, он стараецца, не дал расташчыць страну, как у Расіі. Каб не он, была бы хужэ.

— Сволач ён, усім век заядае, — падвёў выснову Мікола і ўткнуўся зноў у кніжку.

— Да он жа бээнэфавец! — закрычала дама, апэлюючы да публікі. — А? Ты ж бэнээфавец?

— Ня тыкайце, я з вамі сьвіней ня пасьвіў, — сказаў Мікола, не падымаючы галавы.

— Дык ты бээнэфавец ці не? — спытаў Хахол.

— Я журналіст і ў партыі не ўступаю, — адказаў Мікола.

— А, журналіст! — сказала дама. — Ім толька сенсацыі падавай і жараныя факты. Ім праўда неінцярэсна, сенсацыі ішчут.

Міколу ледзь не званітавала. Ён не трываў баналітэту. Ну нашто ён улез у народную гушчу? Ёсьць жа сейбіты й асьветнікі, якія любяць простага чалавека і ўмеюць пагаварыць зь ім. А плюгаваму Міколку лепей маўчаць, ня моцны ён у палеміцы. Яго народ яшчэ ў школе ганяў як шчура.

Дама, расчысьціўшы поле бітвы, вяла далей:

— Харошая у нас страна! І крэдзіт маладым на страіцельства дают, а в Германіі такога нет. Мая доч там жывёт шэсьць лет, так самім прышлось дом пакупаць.

Мікола ня вытрымаў зноў:

— Дык чаго яна сядзіць у той абарванай Германіі? Хай бы сюды прыехала і за крэдзіт пастроілася.

Дама задыхнулася ад злосьці, але вяла далей:

— Вы вот спрашываеце, как я так сахранілась. Я внімацельна атнашусь к сваему здароўю. Дома всегда баня, зімой в сьнег ныраю. А паеду к дочке — выкупаюсь в мінеральнам басейне с пузыркамі, масаж прыму. Всё там есьць, всё харашо, жыві — не хачу. Но я вечарам включу «Белае солнца пустыні», смотру і плачу — скарэй бы дамой. Гергечут што-та па целевізару, што, зачэм — не пайму.

Мікола:

— А чаму Ваша маці ў восемдзесят гадоў сьвіней даглядае, а ня плешчацца ў мінэральным басэйне?

Усе змаўчалі. Але Чырвоны Рот не здалася, нанесла апошні ўдар: дастала з валізы шыкоўную каробку цукерак і пачаставала ўсіх, аж да кіроўцы. А Міколку дэманстратыўна абнесла. Яго разабраў дурнасьмех: зноў цукерачак не атрымаў за доўгі язык. Мікола адкінуўся назад і заплюшчыў вочы. Сядзеньне побач зь ім прагнулася, бліжэй залунаў пах «патройнага адэкалёну». «Хахол. Пагаварыць хоча. О Божа, зноў думай, як гаварыць, каб яму было «панятна». Мікола моўчкі павярнуўся да суседа.

— Сама не жыве тут, а мяне вучыць, як жыць, — паскардзіўся Хахол. І дадаў: — Зачэм ты пытаешся гаварыць па-беларуску, у цябе не выходзіць. Палавіна словаў рускіх, палавіна беларусіх, і па-польску што-та.

— Пра мой язык гаварыць ня будзем. Што ты хочаш ад мяне?

— Напішы стацьцю ў «Савецкую Беларусію» вот пра што: мне карову няма куды здаць. Можна толькі гасударству здаць. А яно дае 150 тыс. за карову. У мяне на пракорм цяляці ў 3—4 разы больш пайшло. Што мне рабіць?

— Шукай іншую работу. Цётка правільна сказала.

— Наш райспалком прыказ іздаў, каб калхозьнікаў у горад ня бралі. Панімаеш, я як у турме. Лепей бы ў турме. Я еду зь Мінска. Два дні вод-

# вяртаецца

пуску было, а пагуляць няма за што. Я нідзе ў жыцьці ня быў. Толькі на ірана-аўганскай граніцы і ў Чарнобылі. Адправілі маладога ў Чарнобыль. Кажуць, едзь, ты вучыўся за гасударсцьвенны шчот. Аддавай даўгі гасударству. Я ж ужо аддаў, так? Дык чаму я як у турме?

— Шукай працу. Загад выканкаму незаконны, — сказаў Мікола і сам адчуў фальш: якія тут законы? — Я напішу пра гэта, але такіх «стацьцёў» тысячы. Яшчэ адна табе нічым не дапаможа.

— Лукашэнка ж пра гэта знаў, так? Ён хлусіць, што ня знаў. Пра гэта ж у газетах гадамі пішуць, так?

— Так.

— Што ж мне рабіць? Нічога не мяняецца. Гадамі нічога не мяняецца. Я люблю зямлю, я не хачу ўхадзіць, а больш так не магу.

— Я ня ведаю, што табе рабіць. Сам думай.

Хахол пайшоў на сваё сядзеньне. А дзядзька абазваўся да Міколы:

— Што ж ты замаўчаў? Зачапіўся за слова, а потым зноў ад нас адвярнуўся. Гэтыя журналісты як міліцыянеры: прычэпяцца, пакрычаць — і стой як абасраны. Уткнуўся ў сваю кніжку, не каб пагаварыць зь людзьмі.

— Пра што? — пытае Мікола, павярнуўшыся, і заўважае, што адна зь дзяўчат пільна глядзіць яму ў вочы. У яе такі выраз, быццам ён яе прыемна зьдзівіў. І Мікола засаромеўся, быццам і сапраўды перамог. І зноў незразумелая радасьць заварушылася ўнутры.

— Можна з табой сустрэцца? — запытаўся Хахол.

— Можна, толькі я пасьлязаўтра еду адпачываць на дзесяць дзён. Вазьмі тэлефон, сазвонімся.

— А я раз у Самаркандзе адпачываў, — сумна сказаў Хахол.

Мікола вылез з аўтобуса на прыпынак раней і пайшоў да летніку пешкі. Адчыніў хату, трохі паеў. Выкасіў газон і трымэрам абабіў вакол альтанкі быльнёг. Працуючы, Мікола згадаў аўтобусны інцыдэнт і, можа, упершыню добра падумаў пра простых людзей. Учора пад піва якраз гаварылі пра гэта зь сябрам.

Мікола:

— Дапусьцім, у Беларусі сто тысяч няпобытавых людзей…

Сябра:

— Якіх?

Мікола:

— Няпобытавых.

Сябра:

— Некалькі дзясяткаў тысяч. Астатнія — паліпы. Я зьдзіўляюся, калі крычаць: «Людзі, адумайцеся!» Народ ёсьць зьвяай жывой прыроды. Той, хто прыйдзе на пляж, стане над крабам і паўтарацьме: «Адумайся, ідыёце! Кама паўзешы?», дабʼецца большага посьпеху, чым любы народнік.

Цёмнае піва, цёмны вечар, цёмная злосьць. Скаргі на закрыцьцё газэтаў, інстытуцыяў, тэлевізіі. Усё менш грошай у альтэрнатыўным грамадзтве, усё цяжэй зарабіць капейку. Жыцьцё наперадзе — як палярная ноч. Пісаць няма куды. Пераклады няма як выдаць. Знаёмыя ўцякаюць за мяжу й звозяць грошы. Наперадзе — трыдзясяты рэфэрэндум. Дык чаму ж на душы так сьветла?

Пад гэтыя думкі Мікола ледзь заўважыў, што на пасе трымціць тэлефон. Ён спыніў трымэр і прыклаў апарат да вуха. У слухаўцы біўся вясёлы, расхмелены голас сябра:

— Дзе ты, пудзіла? Мы ў нашай лазьні, 27 ліпеня адзначаем. Цябе аднаго няма.

Мікола сказаў, што не прыедзе, павіншаваў бяседу і павольна пайшоў у дом. Вось яно. Сёньня 27 ліпеня. Ён згадаў, як шмат год таму ў чорна-белым іхным тэлевізары паказвалі абвяшчэньне Незалежнасьці. Гэта было дзівам. Пахмурны Дземянцей, разгубленыя міны вэтэранаў і камуністаў у ВС, змрочна-ўрачысты твар Пазьняка і табло галасаваньня, на якім высьвечваўся сэнсацыйны, нікім ня мроены вынік галасаваньня: Беларусь стала незалежнай і набыла свае адвечныя пазнакі — сьцяг і герб. Мікола ўзгадаў, як маці з бацькам пілі віно й плакалі, і бацька сказаў: «Усё. Цяпер у нас ёсьць свая краіна».

Некалькі гадоў пасьля абвяшчэньня Незалежнасьці Мікола хадзіў на дэманстрацыі й мітынгі. Ён памятае, якія па-сапраўднаму сьвяточныя былі калёны, калі сьвята яшчэ не было забароненае й забытае, як сьпераду йшоў генэрал Грыб у белым касьцюме, колькі было сьцягоў і кветак. Мікола ніколі ня быў згодзен зь сябрам, які лічыў, што 27 ліпеня — толькі бледны адбітак 25 сакавіка. Маўляў, беларускі каляндарык склаўся, і празь некалькі старонак прасачыліся барвы, кроў і радасьць 25 сакавіка 1918 г.

Рэспубліка Беларусь для маладога Міколы Кахановіча заўсёды была большай рэальнасьцю, чым БНР. 25 сакавіка — сьвята ягоных бацькоў, якія памяталі пра БНР нават за часамі шматпудовай БССР. 25 сакавіка асьвечанае, але й абцяжаранае загінулымі жыцьцямі і надзеямі. 27 ліпеня — новае, сьвежае сьвята маладых, якія сфармаваліся (альбо нават нарадзіліся) ў Рэспубліцы Беларусі. За 27 ліпеня ніхто не паміраў.

Мікола прынёс са склепа і паставіў на ганак паўтузіна піва. Віна няма, будзем сьвяткаваць півам.

Мікола адсалютаваў келіхам і згадаў увесь сёньняшні дзень, гутарку ў аўтобусе, і ўласная радасьць падалася яму не такой ужо і беспрычыннай. Упершыню за дзесяць гадоў Мікола адчуў пэрспэктыву.

Тыранія напачатку мела шык і бляск, агідны адным і мілы іншым. Цяпер гэты бляск згас незваротна. Лукашэнка быў патрэбны хоць бы на тое, каб сплюндраваць небясьпечныя паняткі кшталту «Расеі» ды «саюзу». Чалавек нямала зрабіў для незалежнасьці, але ягоны час мінае. Самы момант для новай хвалі рэнэсансу.

Мікола сербануў піва і дзелавіта пабіў воблінай аб прыступку. Упершыню за многія гады ён сьвяткаваў 27 ліпеня бяз каліва горычы.

**Ева Вежнавец**

Андрэй Хадановіч



## Браслаўскія сьвяты

Тры дні вандровак у памежнай зоне
Пад торбай, што ня муляе пляча.
На лузе коні, белыя ў законе,
Нібы з калгасу «Глюкі Ільліча».

Хаваюся, нібыта партызаны:
Дазвол на ўезд сюды — не драбяза...
А ля касьцёлу, адурэць, — фазаны,
Як глюк, але мясцовага ксяндза.

Увечары шыкоўна і прыемна
Ахвярай дабрыні гаспадароў
П'ю малако, чытаю «Głos znad Niemna»
І прыдумляю вершы будзь здароў.

Мне беларускай нацыі агарак,
Што помніць дапатопныя часы,
Згадае, як раней казаў «zegarek»,
А сёньня дык па-нашаму — «часы».

Вясковых пеўняў стрэлка-перастрэлка.
Дарогі, дзе не начаваў асфальт.
Саракапяцігradусны гарэлкай
Бастылію ўшаноўваю й Грунвальд.

У неабсяжным возеры Дрывяты
Кілбашуся, як рыбіна ў трысьцці,
І разумею: сьвяты, бляха, сьвяты
Здараюцца ў шызоідным жыцьці!

**Ліпень 2003, Браслаўшчына**

АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Фармат для невялікага сьвята

**Гэты дзень у нацыянальнай гісторыі застанецца. Як-ніяк, Рэспубліка Беларусь заявіла пра незалежнасьць. Не Каляды, не Вялікдзень, але ж і які-небудзь Іван Галавасек ці Макавей маюць свой «фармат» сьвяткаваньня. Тое самае — з Днём Волі ці 8 Сакавіка. Як толькі сьвята набывае свой фармат, яно замацоўваецца, прыжываецца, робіцца традыцыяй. Які фармат магло б мець сьвята 27 Ліпеня? «Як сьвяткуюць Дзень Незалежнасьці ў беларускіх асяродках?» — з такім пытаньнем зьвярнулася карэспандэнтка «НН» да беларускіх актывістаў.**

**Зьміцер Сасноўскі, лідэр гурту «Стары Ольса»:** На Дзень Незалежнасьці, як і на іншыя сьвяты, мы гуртам зьбіраемся на кватэры, гатуем нешта лёгкае і набываем піва. У мяне ёсьць вялізны камень, мы яго завём Сьцяпанам, дык прыносім яму невялікія ахвяры — кавалкі хлеба, паліваем яго півам. Сьцяпан заўсёды адзначае разам з намі: ён — на падлозе, мы — за сталом. Мы пʼём за караля, за Вялікага князя, за Беларусь, за гісторыю, за музыку. Запальваем сьвечкі, глядзім гістарычныя фільмы. Так яно адбываецца нягучна, але містычна, па-старадаўняму, у стрыманай абстаноўцы.

Прыкладна такое ж значэньне, як 27 Ліпеня, для нас маюць 25 Сакавіка, Грунвальдзкая бітва, бітва пад Воршай, гадавіна Слуцкага паўстаньня.

**Юнэля Сальнікава, незарэгістраваны гомельскі моладзевы цэнтар «Гарт»:** У Гомелі мы адзначаем гэты дзень разам зь сябрамі іншых моладзевых арганізацыяў. Звычайна едзем зь півам на прыроду. У гэты дзень усе нашыя сябры імкнуцца размаўляць па-беларуску, нават у крамах і іншых грамадзкіх месцах. З раніцы віншуем адзін аднаго. Гэта сьвята блізкае па сэнсу да 25 Сакавіка — Дня Волі. Для нас гэта сьвята той Беларусі, якой яна магла б быць цяпер, калі б пачала нармальна разьвівацца ў 1991 г. Для мяне асабіста вельмі важная эстэтыка гэтага сьвята: гэта дзень пад бел-чырвона-белымі сьцягамі. Гэта дата сьвятая ў нашай гісторыі, хоць яна не такая даўняя і крыві ў 1991 годзе ніхто не пралiваў. А паколькі гэтая незалежнасьць трохі віртуальная, гэта таксама сьвята лёгкага суму па тым, што магло б быць...

**Алесь Зарамбюк, дэпутат Мастоўскага райсавету (Гарадзеншчына):** 27 Ліпеня мы сустракаемся зь сябрамі мастоўскіх дэмакратычных арганізацыяў, на Нёмане робім вогнішча, уздымаем наш сьцяг, смажым кілбаскі, чытаем вершы. У гэтым сьвяце заўсёды прымае ўдзел наша інтэлігенцыя — настаўнікі, дактары. Ёсьць спрэчкі сярод нашых сяброў, якую дату варта сьвяткаваць — 25 Сакавіка альбо 27 Ліпеня, таму мы сьвяткуем абедзьве. Без 25 Сакавіка не было б і 27 Ліпеня. І яшчэ — 27 ліпеня ўпершыню Расея прызнала Беларусь як незалежную краіну. А 3 ліпеня — гэта зусім незразумелая дата. Для нашых людзей гэта толькі дзень вызваленьня Менску ад фашыстаў, а Масты былі вызваленыя 13 ліпеня.

**Юрась Губарэвіч, дэпутат Белаазерскага гарсавету (Берасьцейшчына):** У Белаазерску ў гэты дзень не адбываецца нічога адметнага. Раней, у першыя гады незалежнасьці, людзі вывешвалі сьцягі на балконах, былі дэманстрацыі. Але недзе ў сярэдзіне 90-х усё гэта скончылася. Дата паступова забываецца, і адрадзіць яе, як мне падаецца, нерэальна.

**Андрусь Кавалёў, старшыня незарэгістраванага ГА «Новая зямля» (Магілёў):** З году ў год гэтае сьвята губляе свае пазыцыі, яно застаецца другім пасьля Дня абвяшчэньня БНР. 27 Ліпеня — гэта дзень незалежнасьці сучаснай дзяржавы. Я быў бы рады, каб гэта сьвята набыло рэальны сэнс. Раней мы ў Магілёве ў гэты дзень арганізоўвалі шэсьці, мітынгі, цяпер проста зьбіраемся, зь семʼямі, зь дзецьмі, віншуем адно аднаго, робім сьвяточную вячэру...

**Сяржук Салаш, ГА «Скрыжаваньне» (Барысаў):** Для мяне найважнейшае дзяржаўніцкае сьвята — гэта Дзень волі 25 Сакавіка. Як вядома, у 1991-м годзе Дэклярацыя аб дзяржаўным сувэрэнітэце ўсталявала вяршэнства закону і канстытуцыі, але закону і канстытуцыі тагачасных, гэта значыць савецкіх. Гэта дэклярацыя павінна была даць штуршок адбудаваньню дзяржавы — у эканоміцы, фінансавай сфэры, культуры, спорце. У тым, што пакуль гэтага не адбываецца, — віна ўсіх нас: значыць, штосьці недагледзелі, недаціснулі, недатлумачылі.

Мы зьбіраемся ў гэта сьвята ў сямейным коле. Я цяпер чакаю нараджэньня дачкі, і магчыма, жонка падорыць яе мне якраз у гэты дзень. Тады ён напоўніцца для мяне больш глыбокім і важным сэнсам.

**Апытвала Вэраніка Дзядок**

**Калі 25 Сакавіка слаўнае сваімі масавымі акцыямі і сьвяточнымі абедамі, дык, сапраўды, фармат для нашага 27 Ліпеня напрошваецца сам сабою: гэта выезд за горад, адпачынак на прыродзе. Такога ніхто не забароніць. Цікава, што таксама, традыцыйнымі пікнікамі, адзначаюць свой Дзень Незалежнасьці амэрыканцы. А вось у французаў галоўнае — урачысты парад, а пасьля — вулічныя балі, танцы на плошчах і бульварах. У нас такое пакуль зусім немагчыма.**


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Сп.Адама Мальдзіса** з 71-годзьдзем віншую! Зычу творчых посьпехаў і аптымізму. Аляксей

**Сп.Віктара Манаева** з 45-годзьдзем віншую. Посьпехаў, аптымізму, новых роляў, каханьня зычу! Аляксей

### КАНТАКТЫ

**25 ліпеня Дзень памяці** па Ўладзімеру Караткевічу. Усходнія могілкі, 17.00. М.К.

**31 ліпеня** у 16.00 сорак дзён па Васілю Быкаву. Зьбярэмся каля ягонай магілы. Мікола Купава

**Памолімся** за сьветлую душу Ўладзімера Кармілкіна, што год таму пакінуў нас. Сябры БНФ

**Ці ёсьць** сярод чытачоў «НН» тыя, хто прыходзіў сёлета перад Радаўніцай на магілу В.Іваноўскага?

**ZBSB.org** — сайт Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына». Т.: 289-31-94

**Olsa.by.ru** — сайт беларускай сярэднявечнай музыкі

### ПРАДАМ

**«Фальксваген-Пасат»** 1993 г.в., 1,8 $см^3$, каробка-аўтамат, люк, год у РБ, ц/з. Т.: (8-01591) 20-1-51

**«Опель-Вэктра»** 1990 году, 1,6, люк, магнітола, сыгналізацыя, 1400 у.а. Т.: (8-01591) 39-0-09

**«Опэль-Вэктра»** 1994 году, літыя дыскі, ABS. Т.: (8-01591) 39-0-09

### ПРАЦА

**Масаж**. Нізкі кошт — высокая якасьць. Магчымы выезд дахаты. Т.: 8-029-756-81-99

### КНІГІ

**Кнігі — поштай.** Замаўляйце каталёг: поштай — а/с 333, 220050 Менск. E-mail: exlibris@tut.by, Internet: http://exlibris.cjb.net. Т.: 8-029-643-57-33.

**Кнігі — поштай. Новае:** «Vostraja Brama 7: Ул.Арлоў. Адкусі галаву вароне», Часопіс «Дзеяслоў» №4-2003; ізноў зьявіліся «Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасьці да канца XVIII ст.» і «Невядомая вайна: 1654—1667г.» Г.Сагановіча

! Толькі да жніўня ЗЬНІЖКА
на відэакасэты **«Пан Тадэвуш»**
на 1000 рублёў. А/с 150, 220107,
Менск. Пэйдж.: 211-85-85, аб.25402.
E-mail: belvidea@hotmail.com

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Акаеў А. Кыргыская дзяржаўнасьць і народны эпас «Манас»** / Перакл. І.Качаткова, М.Пазьнякоў. — Менск: Энцыкляпэдыкс, 2003. — 296 с.: іл.

Сьледам за «Рухнамою» Туркмэнбашы на паліцы кнігарняў трапіла кніга прэзыдэнта Кыргызстану Аскара Акаева, перакладзеная па-беларуску. Праўда, у адрозьненьне ад розных «башы», Аскар Акаеў абвесьціў, што ня будзе балятавацца на чарговы тэрмін у 2005 г. Кнігу можна лічыць асновай дзяржаўнай ідэалёгіі тае краіны. Яна стала, паводле слоў аўтара, вынікам 40-гадовых разважаньняў на тэму гістарычных лёсаў кіргізаў. Аўтар давodзіць, што традыцыя кіргіскай дзяржаўнасьці мае 2200 гадоў і толькі пачуцьце родавае еднасьці дазволіла кіргізам не растварыцца ў катле гісторыі. Выданьне суправаджаецца адмысловай прадмовай аўтара да беларускага выданьня. Наклад 600 ас. Дарэчы, на мінулым тыдні «Рухнама» выйшла ў перакладзе на літоўскую і, у адрозьненьне ад бел. выданьня, ня выклікала ніякага галасу.




**Анталёгія сучаснага беларускага мысьленьня.** — СПб.: Невский Простор, 2003. — 496 с. 600 ас.

Сярод патрэбаў, якімі было выкліканае зьяўленьне гэтай кнігі, укладальнікі называюць неабходнасьць лякалізаваць уласную краіну па-за межамі савецкага марксісцкага дыскурсу, асэнсаваць ролю мовы як матрыцы мысьленьня і г.д. У кнігу ўвайшлі тэксты Алеся Разанава, Сяргея Дубаўца, Алеся Чобата, Уладзімера Мацкевіча і яшчэ трох дзясяткаў аўтараў. Уклалі анталёгію Алесь Анціпенка і Валянцін Акудовіч.




**Дарафейчук І. Паганскае кола:** Вершы / Рэд. Л.Сом. — Полацак, 2003. — 84 с. 150 ас.

Унутраная будова гэтага паэтычнага зборніка адпавядае пракаветнаму руху сілаў прыроды, адлюстраванаму ў гадавым коле паганскага календара: «Песьня», «Гуканьне вясны», «Купальле», «Дзяды», «Успамін», «Каляды», «Спроба паганства».

**Якуб Колас. Нёманаў дар:** Апавяданьні, аповесьці. — Менск, 2003. — 431 с.

Чарговая кніга з сэрыі «Беларуская проза XX стагодзьдзя». У зборнік увайшлі найбольш знакамітыя апавяданьні 1906—1929 г., а таксама аповесьць «У палескай глушы» з трылёгіі «На ростанях».

**Сучасная беларуская драматургія: Традыцыі і наватарства** / Уклад. і прадм. П.Васючэнкі; Пад агул. рэд. У.Сіўчыкава. — Менск, 2003. — 640 с.

Чатыры разьдзелы кнігі — «Клясыка й сучаснасьць» (Купала, Макаёнак), «Традыцыя» (Петрашкевіч, Дзялендзік, Дудараў, Бутрамееў, Кавалёў), «Экспэрымэнт» (Арахоўскі, Багданава, Карэлін), «Дзіцячая драматургія» (Рублеўская, Сіўчыкаў, Васючэнка) — складаюцца з твораў розных жанраў — ад традыцыйных гістарычнай драмы, трагедыі, камэдыі, мэлядрамы й псыхалягічнай драмы да экспэрымэнтальнай п'есы. Прыдбаць выданьне можна ў «Сьветачы» і «Акадэмкнізе». Цана — блізу 6500 руб.

**Ціхаміраў А. Беларусь у сыстэме міжнародных адносінаў пэрыяду пасьляваеннага ўладкаваньня і польска-савецкай вайны (1919—1921 г.).** — Менск, 2003. — 400 с. 260 ас.

Падрабязна разгледжаная дыпляматычная і ўнутрыпалітычная дзейнасьць ураду БНР, у тым ліку й пасьля ўзьнікненьня ССРБ ды БССР, раскрытыя пазыцыі кіраўніцтва РСФСР у адносінах да «беларускага пытаньня», палітыка Польшчы, прааналізаваная сутнасьць савецка-польскага канфлікту. Асобныя падразьдзелы прысьвечаныя «палескаму паходу» С.Булак-Балаховіча, Рыскай дамове. Цана ў «Акадэмкнізе» — 11500 руб.

**Філяматы:** Бюлетэнь РГА «Таварыства аматараў ведаў (філяматаў)» / Гал. рэд. Ю.Хадыка. — 2003. — № 1(4).

Аднавіў выхад Бюлетэнь Народнага Ўнівэрсытэту. Нумар адкрывае аналітычны артыкул У.Роўды «Канцэпцыі паходжаньня нацыяналізму». Матэрыял А.Слонімскага знаёміць з вынікамі сацыялягічнага апытаньня, праведзенага сярод прадпрымальнікаў у 1997—98 г. Вынікі дазволілі вылучыць асаблівасьці прыватнай вытворчасьці ў беларускіх умовах ды выявіць перашкоды на шляху разьвіцьця малых прадпрыемстваў. У нумары друкуюцца таксама артыкулы Л.Лыча «Змагаўся за Айчыну — спачывае на чужыне», А.Хадыкі «Роская мастацкая калекцыя» і інш.

**Шамякін І. Збор твораў. Т. 2. Трывожнае шчасьце:** Аповесьці. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 527 с.

За 5530 руб. у большасьці менскіх кнігарняў ахвотныя могуць прыдбаць памятную са школы пэнталёгію «Трывожнае шчасьце».

**Анатолий Козлович. Белорусы между небом и землей.** — Смаленск, 2003. 1000 ас.

Аповесьці-эсэ Казловіча — гэта гісторыя нашага пакаленьня, храналёгія падзей станаўленьня самастойнай, незалежнай дзяржавы ад часоў дзейнасьці Вярхоўнага Савету XII скліканьня да сёньняшніх дзён, характарыстыка дзейнасьці многіх вядомых палітыкаў ад правага да левага крыла палітычнага руху краіны.

**Макушников О. Гомель с древнейших времён до конца XVIII века:** Историко-краеведческий очерк. — Гомель, 2002. —244 с. 600 ас.

У адной кнізе аўтар паспрабаваў сабраць усё самае цікавае з «дарасейскай» гісторыі гораду. Апісаньне пэрыяду ВКЛ ды Рэчы Паспалітай выйшла нейкае нэўтральнае. Маўляў, добра гэта ці не? Ці можам мы гэта сабе дазволіць ужо, ці не? Як бы там ні было, але супраць праўды не папрэш — білі люд тутэйшы і чужынцы, і свае... нібыта. Спадабаліся тыя ўрыўкі, дзе разглядаюцца ды аналізуюцца археалягічныя знаходкі старога гораду (у аўтара ёсьць і іншыя кнігі, прысьвечаныя археалягічнаму дасьледаваньню Гомелю і ваколіцаў). Цікавыя малюнкі, зробленыя Ю.Луніненка. Асабліва ўражвае выява Гомелю XII ст. на вокладцы: можна заўважыць дзьве мураваныя царквы. Частку дакумэнтаў, пададзеных у кнізе, можна было знайсьці на старонках двухтомніка «Памяць», прысьвечанага Гомелю, але сустракаюцца і раней невядомыя чытачам. Прадаецца кніга ў Гомелі, каштуе 7310 руб. Напэўна, зьявіцца і ў менскіх кнігарнях.

**Тацяна Вабішчэвіч, Андрэй Ананьеў, Мікола Лавіцкі**

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________

## КРЫЖАВАНКА



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1.** Ваўчынае сонца. **4.** Няздольнасьць краіны плаціць за свае забавязаньні, як у Расеі ў 1998-м. **9.** З націскам на другім складзе — «бацька» Кандыда; з націскам на першым — нямецкі пісталет. **10.** Неабходная, істотная ўласьцівасьць прадмета ці зьявы. **13.** З гэтага слова зазвычай пачынаюць тэлефонную размову. **14.** Трос на караблі для пад'ёму ветразяў, сьцягоў і іншага. **15.** Каляжанка явара ў народных песьнях. **16.** Мусульманская вуаль. **17.** Залоза ў складзе мочапалавой сыстэмы, якую мужчынам крый божа застудзіць. **19.** Горад на Гарадзеншчыне, знакаміты помнікам Скарыну, замкам і броварам. **21.** Тэкст, напісаны ад рукі. **24.** Абавязковы элемэнт прычасьця. **26.** Верш, напісаны з нагоды чыёйсьці сьмерці. **28.** Той, хто займаецца навукай ці мастацтвам, ня маючы глыбокіх ведаў у абранай галіне. **31.** Грузінскі мастак, аўтар знакамітага савецкага плякату «Радзіма-Маці кліча!». **32.** Імя прэзыдэнта Румыніі. **34.** Месца на беразе ракі, куды звозяць бярвеньне для сплаву і дзе вяжуць плыты. **35.** Школьнае практыкаваньне: слухаеш, а пасьля распавядаеш сваімі словамі. **37.** Украінскі пісьменьнік, гутарка зь якім нядаўна была ў «НН». **38.** Традыцыйны беларускі галаўны ўбор у выглядзе шапачкі з вушкамі, якая завязвалася пад падбародкам. **39.** Тонкае ліставое жалеза.

**ПА ВЭРТЫКАЛІ: 1.** Прадстаўнік сям'і слановых, крыніца вітаміну А для нашых далёкіх продкаў. **2.** Мужаў бацька. **3.** Пашыраны ў Беларусі карысны выкапень, што можа выкарыстоўвацца як паліва, угнаеньне, цеплаізаляцыйны матэрыял і да т.п. **5.** Бульба, якой нас кормяць у «Макдональдзе». **6.** Абагаўлёная жывёліна, што лічылася родапачынальніцай племені. **7.** Невялікія могілкі пры царкве. **8.** Від капусты. **11.** «У маркоце Янка галавой панік, упусьціла дзеўка беленькі ...» (В.Вярба). **12.** Тое, што позна піць, калі адваліліся ныркі. **16.** Невысокая агароджа ўздоўж мосту, набярэжнай, тэрасы і г.д. **18.** Вялікая (да 25 см) ядавітая амэрыканская рапуха. **20.** Прафэсія Міхаіла Фінбэрга. **22.** Напрамак у мастацтве, які адлюстроўвае жыцьцё вялікіх гарадоў. **23.** Аповесьць Васіля Быкава. **24.** Латвійская марка радыёапаратуры, папулярная за савецкім часам. **25.** Раённы цэнтар у Менскай вобласьці, які стаіць на рацэ Лань. **27.** Уласьцівасьць фізычных целаў, якая не дае ім магчымасьці імгненна спыніцца ці набраць хуткасьць. **29.** Горад, паводле біблійнага паданьня, разбураны Богам. **30.** Украінскі народны танец. **33.** Беларуская газэта на Беласточчыне. **36.** Частка п'есы, спэктаклю.

**Склаў Сяргей Петрыкевіч**

### Адказы на крыжаванку з №26

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** 4. Раінчык. 7. Тарту. 8. Адгон. 9. Ажгірэй. 11. Пагода. 14. Канкан. 17. Агрэман. 18. Вада. 19. ЗАГС. 20. Фэтышызацыя. 21. Філі. 22. Роба. 23. Карлсан. 25. Абібок. 27. Нэаген. 29. Прамова. 32. Цэгла. 33. Дрыса. 34. Скаціна.

**ПА ВЭРТЫКАЛІ:** 1. Лінг. 2. Шчур. 3. Басра. 4. Руанда. 5. Кайман. 6. Ворша. 10. Імпэрыялізм. 11. Правіца. 12. Графіці. 13. Агрызак. 14. Караван. 15. Казярог. 16. Нагібін. 23. Компас. 24. Нэвада. 26. Бісэр. 27. Ельск. 30. Абак. 31. Опій.

Віншуем Юлію і Сержука
Сматрычэнкаў з павелічэньнем сям'і!
Няхай дачушка гадуецца здаровая.

Нашаніўцы

## Кветкі Купалу і пікет

**У нядзелю 27 ліпеня ў Купалаўскім сквэры адбудзецца ўскладанне кветак да помніка Янку Купалу.** Гэтак сябры Народнае Грамады мяркуюць адзначыць стогадовы юбілей беларускай сацыял-дэмакратыі і Дзень Незалежнасці. Усіх ахвотных запрашаюць далучацца. Пачатак у 14.00. А ў баранавіцкім Маладым парку ад 12.00 да 14.00 адбудзецца пікет «Незалежную Беларусь — у Эўразьвяз!» Акцыю ладзіць мясцовая суполка БНФ.

## Народзіны Геніюш

**Сьвяткаваньне 93-е гадавіны з дня народзінаў Ларысы Геніюш адбудзецца ў Зэльве 9 жніўня.** У Зэльвенскай царкве адслужаць імшу, будзе сьпяваць гарадзенскі хор духоўнай музыкі «Бацькаўшчына», на магілу паэткі ўскладуць кветкі.

## Саракавіны па Быкаву

**На Саракавіны па Быкаву** сябры і чытачы зьбіраюцца на Ўсходніх могілках 31 ліпеня ад 16-й гадзіны.

**РР, Андрэй Мялешка**

## КОНКУРС «НН»

**Ф**рацыск **С**карына **Б**ачыўся **З Ж**ыхарамі **П**рагі — **Ч**эхамі. **Ч**акалі **П**алачане **Ж**ніВеньскую **З**ьнічку **Б**еларусіна **С**карыны **Ф**ранцішка.

**Аляксей С., Жодзіна**

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Сяргей Ёрш |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3468.

Нумар падпісаны ў друк 23.07.2003.

Замова № 3767 .

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а